© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Намеснік галоўнага рэдактара
Усевалад Рагойша
Заснавальнік Павел Жук
Наклад 34.950
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Аўторак, 5 жніўня 1997 г. № 84 Кошт свабодны

15 журналістаў перад судом

У мінулую пятніцу суддзі Ленінскага райсуда Мінска працавалі ва ўзмоцненым рэжыме. Разглядаліся справы 15 журналістаў, арыштаваных напярэдадні каля прэзідэнцкай адміністрацыі падчас пікету ў абарону здымачнай групы ОРТ.

Усе «парушальнікі дэкрэта № 5» з'явіліся ў суд самі. У чацвер іх больш як 4 гадзіны пратрымалі ў міліцэйскім пастарунку, склалі на ўсіх пратаколы і выдалі судовыя павесткі. Паколькі падсудных было шмат, суддзі прыдзялялі на разгляд адной справы ў сярэднім па 20 хвілін. Сведкамі выступалі міліцыянты, якія затрымлівалі журналістаў (такая практыка ўжо стала нормай у беларускіх судах). Усе нашыя калегі былі прызнаныя вінаватымі ў правядзенні несанкцыянаванага шэсця і пікету, а прыгаворы суддзі вынасілі розныя. У выніку карэспандэнт БДГ Андрэй Махоўскі атрымаў штраф у 5 мільёнаў рублёў, Людміла Маслюкова («Народная воля»), Леанід Канфер (радыёстанцыя «Эхо Москвы»), Уладзімір Шлапак (фотакарэспандэнт газеты «Знамя юности»), Уладзімір Мацкевіч (рэдактар часопіса «Культурная палітыка») і Дзмітрый Бандарэнка (фонд падтрымкі недзяржаўных СМІ) пакараныя на 3 мільёны рублёў. Ірыне Халіп («Имя»), Алегу Бебеніну («Имя»), Вользе Тамашэўскай («БДГ»), Ігару Чарткову (латвійская газета *Neatkariga*), Іне Студзінскай (Радыё 101,2), Уладзіміру Андронаву (сусветныя навіны *WTN*, апэратар), Леаніду Міндліну (карэспандэнт *WTN*), Уладзіміру Бабарыку (аператар агенцтва *Reuter*) — вынесенае папярэджанне. Суд адклаў разгляд справы толькі карэспандэнта газеты «Товарищ» Валерыя Шчукіна. Не выключана, што супраць т.Шчукіна як *«неадназовага злоснага парушальніка»* прэзідэнцкага дэкрэта ўлады збіраюцца ўзбудзіць крымінальную справу.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

(Працяг тэмы на стар. 3)

На здымку: затрыманне Валерыя Шчукіна.

Будучы пасол ЗША занепакоены падрывам дэмакратычных інстытутаў у Беларусі

Як паведаміла амбасада ЗША, у бліжэйшы час чакаецца зацвярджэнне Дэніэла Спекхарда на пасадзе пасла ЗША ў Мінску.

З гэтай нагоды Д.Спекхард выступіў 29 ліпеня на слуханнях у амерыканскім Сенаце. Прызначаны прэзідэнтам Клінтанам пасол выказаў асаблівую занепакоенасць тым, што *«кіраўніцтва Беларусі займаецца сістэматычным падрывам дэмакратычных інстытутаў і абмяжоўвае свабоды, якія мы, у Амерыцы, успрымаем як належнае»*. Па словах Д.Спекхарда, за тры апошнія гады ў Беларусі назіраецца *«прыкметны адыход»* ад дэмакратычнай сістэмы, якая забяспечвае правы чалавека. Сярод такіх крокаў ён згадвае *«арышт мірных дэманстрантаў і высылку замежных журналістаў і дыпламатаў»*.

Д.Спекхард сказаў, *«калі Беларусь памяняе сваю цяперашнюю палітыку, памяняюцца і адносіны да яе. Беларусь павінна вярнуць дэмакратычныя стрыманні і процівагі ў сістэму свайго дзяржаўнага ўпраўлення, дазволіць нязгодным выказваць сваю думку ва ўрадзе і ў сродках масавай інфармацыі, а таксама ажыццявіць лібералізацыю эканомікі»*. Альтэрнатывай гэтаму, па словах Д.Спекхарда, *«з'яўляецца далейшая ізаляцыя Беларусі ад міжнароднай супольнасці і эканамічны заняпад»*.

А.Д.

Амерыканскі штабіст у Мінску

На мінулым тыдні ў рамках праграмы «Ваенныя — ваенным» Беларусь наведаў прадстаўнік Еўрапейскага камандавання Узброенымі сіламі Злучаных Штатаў Амерыкі падпалкоўнік Кэмбел.

Падчас перамоваў з прадстаўнікамі Міністэрства абароны, Галоўнага штаба Узброеных сіл Беларусі, штабаў Ваенна-паветраных сіл і войскаў Супрацьпаветранай абароны абмяркоўваліся пытанні, якія датычацца планавання і правядзення шматнацыянальных вучэнняў. Беларускую дэлегацыю на гэтых сустрэчах узначальваў першы намеснік начальніка Галоўнага штаба Узброеных сіл палкоўнік Юрый Сяменчанка.

БелаПАН

Свет глядзіць у камеру Паўла Шарамета

Дырэктар Беларускага бюро ОРТ Павел Шарамет і ягоны адвакат накіравалі патрабаванне на імя Генеральнага пракурора Беларусі перадаць вядзенне следства літоўскім праваахоўным органам. Менавіта гэта, на думку падследнага, можа забяспечыць аб'ектыўнасць следства.

Пакуль просьба не будзе разгледжаная, Павел Шарамет адмаўляецца даваць паказанні. Дарэчы, прадстаўнікі дэпартамента памежнай паліцыі МУС Літвы сцвярджаюць, што факта парушэння дзяржаўнай мяжы здымачнай групай ОРТ *«не зафіксавана»*. У пятніцу, 1 жніўня, Паўлу Шарамету не дазволілі перадаць кнігі і газеты. Аднак учора стала вядома, што ў ягонай камеры ўстанавілі тэлевізар.

Скандал, звязаны з арыштам здымачнай групы ОРТ і ўтрыманнем яе ў следчым ізалятары Гродзенскай абласной управы КДБ, прывёў да пахаладання беларуска-расійскіх адносінаў. Падобна, што Крэмль пачынае цверазець пасля ап'янення саюзам з лукашэнкаўскім рэжымам. Прэзідэнт Ельцын пацвердзіў, што для яго прыярытэтным застаецца дэмакратыя і свабода слова. Не без іроніі Ельцын заўважыў у адрас беларускага інтэгратара, што ён, *«магчыма, малады і дрэнна вытрымлівае крытыку, надта гарачы ў гэтым плане»*. Нагадаем, што Лукашэнка запатрабаваў тлумачэнняў ад Ельцына, які выступіў у абарону расійскіх журналістаў ОРТ. Больш таго, Рыгоравіч абвінаваціў Паўла Шарамета ў атрыманні грошай ад замежных спецслужбаў. (У прэс-службе КДБ на гэты конт не маюць дакладных звестак.) Шантаж і пагрозы Крамлю дасягнулі свайго апагею.

У гэтай сітуацыі губернатар Калінінградскай вобласці Леанід Гарбенка адмовіўся прыняць прэзідэнта Лукашэнку. Ноччу, за некалькі гадзін да вылету беларускай дэлегацыі, у рэзідэнцыю на Карла Маркса, 38 прыйшоў факс, у якім губернатар, *«як прыхільнік свайго прэзідэнта і сын расійскай Айчыны»*, запатрабаваў урэгуляваць пытанні, звязаныя з арыштам журналістаў ОРТ. Прэзідэнт Лукашэнка, які знаходзіцца ў міжнароднай ізаляцыі, цяпер не атрымаў магчымасці патрапіць нават у расійскую губерню. Шлагбаум апусціўся, а Рыгоравіча замест Балтыйскага ўзбярэжжа расіяне пасадзілі ў лужыну. Прэзідэнцкая кантора пачала нервавацца. На прэс-канферэнцыі прадстаўнік прэзідэнта ў органах беларуска-расійскага Саюза Васіль Далгалёў назваў тэкст факса *«абуральнай і беспардоннай знявагай»*, абвінаваціўшы ва ўсім «праціўнікаў інтэграцыі».

Сярод іх прэзідэнт Лукашэнка вылучыў першага віцэ-прэм'ера Анатоля Чубайса. Прэс-служба расійскага кіраўніка заўважыла, што *«наўрад ці трэба прэзідэнту Беларусі даваць ацэнкі і характарыстыкі членам урада іншай, нават саюзнай краіны»*.

Ёсць усе падставы думаць, што прэзідэнт Лукашэнка, які не ўмее прайграваць з годнасцю, скарыстае «справу Шарамета» для паказальнага суда над іншадумствам. Лукашэнка мае сваіх адвакатаў у Расійскай Думе — сярод камуністаў і жырыноўцаў.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

У суботу адвакат Гары Паганяйла падаў у Ленінскі суд Гродна скаргу аб незаконным затрыманні здымачнай групы ОРТ з трох чалавек.

Кіраўнік здымачнай групы Павел Шарамет і аператар Дзмітрый Завадскі ўтрымліваюцца пад вартай па абвінавачванні ў незаконным перасячэнні дзяржаўнай мяжы групай асобаў па папярэдняй змове (арт.80 п.2 КК Беларусі). Але П.Шарамет віну па гэтым артыкуле не прызнаў і даў вычарпальныя тлумачэнні ўсіх дзеянняў здымачнай групы. Між тым, па апошніх звестках, тэхнічнаму супрацоўніку Яраславу Аўчыннікаву абвінавачванне не прад'яўлена, і ён утрымліваецца пад вартай без усякіх тлумачэнняў.

Брыгада ОРТ рыхтавала рэпартаж з беларуска-літоўскай мяжы на тым яе ўчастку, адзначае Паганяйла, які не абсталяваны ў інжынерным плане (адсутнічаюць кантрольная паласа, папераджальныя знакі, агароджа і г.д.). Таму, лічыць адвакат, хоць у дзеяннях П.Шарамета фармальна і прысутнічаюць прыкметы парушэння закона, усё ж з-за малазначнасці яны не ўяўляюць грамадскай небяспекі і не падпадаюць пад паняцце злачынства.

Дарэчы, П.Шарамет, Д.Завадскі і Я.Аўчыннікаў ужо праследаваліся ў адміністратыўным парадку, пры затрыманні іх 22 ліпеня былі складзены пратаколы *«за парушэнне памежнай зоны»*.

Супрацоўнікаў ОРТ працягваюць трымаць пад вартай паасобку, але ёсць звесткі, што П.Шарамет пераведзены ў агульную камеру. Па словах адваката Г.Паганяйлы, суд над імі павінен адбыцца ў канцы тыдня. І калі мера стрымання не будзе змененая на падпіску аб нявыездзе, то П.Шарамет аб'явіць галадоўку, паведамілі ў беларускім бюро ОРТ.

Адвакат Г.Паганяйла ў пададзенай скарзе таксама заяўляе, што пры затрыманні і допытах П.Шарамета з боку праваахоўных органаў мелі месца грубыя працэсуальныя парушэнні. У следства, лічыць Г.Паганяйла, не было ніякіх падставаў абіраць мерай стрымання ўтрыманне пад вартай.

Раман ЮРЭВІЧ, Аляксандр ШКУЦЬКО

Хамайду арыштавалі за песні

На трое сутак апынуўся ў камеры віцебскага прыёмніка-размеркавальніка актывіст дэмакратычнай арганізацыі «Выбар» Барыс Хамайда.

Такое рашэнне прыняў на мінулым тыдні суддзя Чыгуначнага райсуда Віцебска А.Фёдараў. Мы паведамлялі, што 11 ліпеня ў дзень адкрыцця «Славянскага базару» Хамайда і яшчэ трое актывістаў выбару наладзілі ў цэнтры горада пікет пад назвай «Фестываль славянскай частушкі». Пікетчыкі ў чатыры галасы выконвалі вядомую паэму Ведзьмака Лысагорскага «Лука Мудзішчаў — прэзідэнт» і былі арыштаваныя міліцыяй. На падставе міліцэйскага пратакола Б.Хамайда быў прызнаны ў парушэнні «пятага дэкрэту» і на трое сутак адпраўлены за краты. У камеры сп.Хамайда аб'явіў галадоўку.

А.Н.

Смутак не бывае пад фанаграму

3 жніўня на востраве ля Траецкага прадмесця ў Мінску адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны ўгодкам адкрыцця помніка беларускім вайскоўцам, што загінулі ў Афганістане.

Усё прайшло значна сціплей, чым летась. Прэзідэнт не пажадаў прыехаць, але за паўгадзіны да пачатку ягоны картэж праімчаўся побач. Відаць, каб пракантраляваць, ці ўсё добра падрыхтавана, і каб паказаць, што прэзідэнт — ён усюды, яму да ўсяго ёсць справа. Не прыехаў і самы высокапастаўлены «афганец» у Беларусі — дзяржсакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман.

Прамоўцы, паміж якімі былі старшыня «палаты прадстаўнікоў» А.Малафееў, міністр абароны А.Чумакоў, пісьменнік М.Чаргінец, прадстаўнікі «афганскіх» арганізацыяў, а таксама ўдава аднаго з загінуўшых афіцэраў гаварылі амаль што аднолькавымі словамі. Пра тое, як добра 30.000 беларускіх хлопцаў выканалі свой абавязак. Пра тое, што трэба памятаць пра кожнага з амаль васьмісот палеглых. Іван Ціцянкоў і палкоўнік Цесавец маўчалі.

Амаль усе прамоўцы выказвалі персанальную падзяку А.Лукашэнку за падтрымку «афганцаў». Але ніхто не сказаў пра тое, за што змагаліся і чаму загінулі гэтыя хлопцы, хто вінаваты ў іх смерці. Толькі А.Чумакоў ахарактэрызаваў гэтую вайну як асабіста для яго «незразумелую».

Падчас мітынгу чалавек пяць выйшлі да двух мікрафонаў, каб выканаць песню І.Лучанка і Г.Сакалоўскага пра Афганістан. Але ім не ўдалося стварыць уражанне, што яны — гэта і ёсць хор, запісаны на стужцы: яны нават не паспявалі за запісам. Дый усё свята нагадвала кепска зробленую «фанаграму».

Летась у рэпартажы з адкрыцця помніка беларусам, што палеглі на той дзікай вайне ў Афганістане, СВАБОДА пісала: «Гэта — помнік нашым землякам на нашай зямлі. Толькі чужая «великая Родина» магла пасылаць на смерць у чужую зямлю. Свая краіна — ставіць капліцу. Помнік афганцам — ганьба той краіне, вечны смутак для гэтай». Уладам не спадабалася наша трактоўка, і яны вынеслі газеце «папярэджанне».

Прайшоў год, стаіць капліца на востраве ў цэнтры Мінска, трывае смутак. Памяць пра трагедыю і жалоба не патрабуюць урачыстых песень. Тым больш пад фанаграму.

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

Выйшла з шоку – палагоднела

На мінулым тыдні ў рэанімацыю Пружанскай раённай бальніцы была дастаўлена 37-гадовая жанчына з апёкамі цела I—II ступені.

Жанчына спачатку сцвярджала, што пасля сямейнай сваркі муж абліў яе бензінам і падпаліў. Урачам каштавала нямала намаганняў, каб выратаваць жыццё пацярпелай. Але, ачуняўшы ад шоку, жанчына раптам змяніла свае паказанні і заявіла, што муж ні ў чым не вінаваты, а яна апяклася сама, неасцярожна запаліўшы агонь у непасрэднай блізкасці ад каністры з бензінам.

Мясцовая міліцыя спыніла следства і пакінула мужа на волі.

Язэп СІНІЦКІ

Падпіску на газету СВАБОДА з верасня можна аформіць у любым аддзяленні пошты і Белсаюздруку да 10 жніўня.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Суд над Статкевічам адкладваецца

Учора ў 10 гадзін раніцы павінен быў адбыцца суд над лідэрам БСДП «Народная Грамада» Мікалаем Статкевічам.Але суддзя А.Крапіўка сказала, што матэрыялаў справы недастаткова, сітуацыя вельмі няпэўная, разгляд справы пераносіцца.

На здымку: Мікалай Статкевіч.

Статкевічу інкрымінуюцца «парушэнні» падчас масавых акцый ў Мінску, калі лідэры Грамады вялі калоны дэманстрантаў па вуліцах сталіцы. На мінулым тыдні, 30 ліпеня, лідэр беларускіх сацыял-дэмакратаў Мікалай Статкевіч быў запрошаны на размову з міністрам унутраных справаў В.Агальцом. Як вынікала з запрашэння, размова тычылася б праблем узаемадзеяння арганізатараў і міліцыі падчас масавых акцый пратэсту.

Але М.Статкевіч адмовіўся весці перамовы з В.Агальцом. Як пракаментаваў прэс-сакратар Грамады П.Карназыцкі, *«мы будзем размаўляць тады, калі будзем бачыць шчырае жаданне з афіцыйнага боку»*.

Пасля адмовы Статкевіча ў штаб-кватэру БСДП прыйшоў судовы выканаўца, каб праверыць наяўнасць маёмасці, апісанай ў траўні за даўгі па арэндзе памяшкання. Грамада лічыць, што ўлады беспадстаўна павысілі памер арэнднай платы.

Людміла ЧАПРОЎСКАЯ

Грамадска-палітычная сітуацыя ў Мінску ў цэлым пагоршылася

А што палепшылася — ніхто не змог сказаць

Сацыялагічнае апытанне на тэму «Грамадска-палітычная сітуацыя ў Мінску» правёў Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў.

Жыхарам сталіцы было прапанавана параўнаць цяперашнюю палітычную сітуацыю з той, якая была да абрання першага прэзідэнта Беларусі — у 1994 годзе. Большасць апытаных (43%) лічаць, што грамадска-палітычная сітуацыя ў Мінску змянілася да горшага. Кожны пяты прытрымліваецца супрацьлеглай думкі. Такая ж колькасць рэспандэнтаў (20%) адказала, што сітуацыя ў Мінску не змянілася. Астатнія грамадзяне не змаглі адказаць.

Пры гэтым 44% апытаных мінчан не бачаць ніякіх тэндэнцый да паляпшэння палітычнай сітуацыі ў сваім горадзе. Больш як трэць рэспандэнтаў (37%) не змагла адказаць на гэтае пытанне.

Цікава, што 19% апытаных лічаць, што апошнім часам з'явіліся прыкметы паляпшэння сітуацыі, аднак на пытанне *«У чым гэта праяўляецца?»* — ніводзін з іх адказаць не змог.

БелаПАН

Шмат шуму — і 3,5 года турмы

Гучная і надзвычай доўгая справа Уладзіміра Сямёнава, былога кіраўніка магілёўскага АП «Магатэкс», урэшце скончылася.

Спачатку следства, а потым разгляд справы ў судзе занялі амаль 2,5 года. Нагадаем нашым чытачам: Сямёнаву інкрымінаваліся шматлікія парушэнні, прысваенне многіх тысяч долараў і г.д. Задоўга да суда свой «вердыкт» вынес і прэзідэнт, які ацаніў дзейнасць Сямёнава ў 10 год турмы. Але ў судовым працэсе амаль усе абвінавачванні (у тым ліку ў хабарніцтве, незаконным прысваенні сродкаў) не атрымалі пацверджанняў. Кастрычніцкі райсуд Магілёва пакінуў за Сямёнавым *«злоўжыванне службовым становішчам, якое мела цяжкія наступствы»*. Былога дырэктара АП «Магатэкс» прыгаварылі да 3,5 года зняволення. Большую частку гэтага тэрміна Сямёнаў ужо адсядзеў у час следства.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі – самая горшая ў Еўропе

«За тры гады знаходжання на пасадзе прэзідэнта Аляксандр Лукашэнка павярнуў назад амаль усе пазітыўныя змяненні ў галіне правоў чалавека, свабод і дэмакратызацыі, якімі была адзначана эра перабудовы і постсавецкі перыяд» — такі асноўны вывад даклада праваабарончай арганізацыі *Human Rights Watch* аб парушэнні правоў чалавека ў Беларусі.

1 жніўня гэты дакумент пад назвай «Беларусь: падаўленне грамадзянскай супольнасці», над якім праваабаронцы працавалі цэлы год, прадставілі журналістам старшыня кансультацыйнага савета названай арганізацыі Джонатан Фэнтан і дырэктар маскоўскага яе прадстаўніцтва Дыдэрык Лохман. Па словах Дж.Фэнтана, асноўная мэта прыезду ў Мінск — выказаць беларускім уладам сваю заклапочанасць наконт парушэння правоў чалавека. Дж.Фэнтан заклікаў *«беларускі ўрад спыніць свае бязлітаснае наступленне на свабоду слова і сходаў»*. Ён не змог прывесці аналагічных прыкладаў настолькі абуральнай сітуацыі галіне правоў чалавека якая склалася ў Беларусі, нягледзячы на доўгі тэрмін працы ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Беларускія ўлады, па словах замежных праваабаронцаў, парушаюць не толькі нацыянальнае заканадаўства, але і нормы міжнароднага права, у прыватнасці — Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, ратыфікаваны Беларуссю. Больш за тое, сп. Фэнтан прагназуе далейшае пагаршэнне з правамі чалавека ў Беларусі. *Human Rights Watch* заклікае еўрапейскія структуры дабівацца аднаўлення законнасці ў Беларусі, а таксама ўзмацніць падтрымку грамадзянскай супольнасці ў Беларусі шляхам фінансавага і тэхнічнага садзейнічання.

БелаПАН

Вінаватыя ўрад і прэзідэнт

Так лічаць большасць апытаных беларусаў

Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) правёў нацыянальнае апытанне наконт матэрыяльнага становішча жыхароў Беларусі. У прыватнасці, 1.433 рэспандэнтам, якія прадстаўляюць розныя сацыяльна-дэмаграфічныя групы насельніцтва, было прапанавана адказаць на пытанне: *«Як змянілася эканамічная сітуацыя ў Беларусі за апошні год?»*. Большасць рэспандэнтаў (51%) лічаць, што сітуацыя пагоршылася. На думку 30%, яна не змянілася; 19% апытаных адзначылі паляпшэнне эканамічнай сітуацыі. На пытанне *«Як змянілася ваша матэрыяльнае становішча за апошні год?»* 50% адказалі, што яно пагоршылася, у 38% яно не змянілася. Толькі кожны дзесяты адчуў паляпшэнне свайго матэрыяльнага становішча.

Адказнасць за пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў краіне большасць апытаных усклалі на ўрад і прэзідэнта — 56% і 49% адпаведна. Кожны трэці рэспандэнт абвінавачвае мафію, кожны чацвёрты — мясцовыя ўлады.

БелаПАН

Расце колькасць цяжкіх злачынстваў

За першую палову 1997 года ў Беларусі зарэгістравана 65 тысяч злачынстваў — на 3,5% больш, чым у студзені-чэрвені 1996 г.

Такім чынам, учынена 63 злачынствы на 10.000 жыхароў. Пры гэтым колькасць наўмысных забойстваў і замахаў на забойства павялічылася на 13,2% у параўнанні з першай паловай мінулага года — усяго 567 выпадкаў. Пачасціліся таксама выпадкі згвалтаванняў і замахаў на згвалтаванне — на 6,7%, усяго 271 выпадак.

Раскрывальнасць злачынстваў у студзені-чэрвені 1997 года склала 68% (супраць 66% у першай палове 1996 г.).

БелаПАН

СТАТЫСТЫКА

Гомельская вобласць: 4,5 тысячы чалавек у мінусе

По дадзеных абласнога ўпраўлення статыстыкі, за 6 месяцаў гэтага года на Гомельшчыне нарадзілася 7.232 чалавекі, што на 5,6% менш, чым за той жа перыяд 1996 года.

За гэты ж час памерлі 11.638 чалавек. Такім чынам, насельніцтва зменшылася на 4.406 чалавек. Колькасць шлюбаў склала 4.419, разводаў — 4.401, пры гэтым у параўнанні з мінулым годам шлюбаў паболела на 9,5%, а разводаў — на 20%.

Колькасць эканамічнага актыўнага насельніцтва вобласці складае 708 тысяч чалавек, з якіх маюць працу 645 тысяч. Пры гэтым у дзяржаўным сектары эканомікі працуе 68%, а ў прыватным — 32%. Колькі занята ў ценявой эканоміцы — статыстыка не паведамляе.

Што тычыцца заробкаў гомельцаў, дык у чэрвені сярэдні налічаны заробак склаў па вобласці 2.184.000 рублёў. Пры гэтым рабочым і служачым было налічана ў сярэднім па 2.296.000 рублёў, а вось калгаснікам — толькі па 1.107.000 рублёў.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Беларусь «засаюзіла»

«Вертыкаль» пачала ўтвараць яшчэ адну псеўдаграмадскую «патрыятычную» структуру — Беларускі грамадскі камітэт «Союз»

Аддзяленні гэтай арганізацыі пачалі ствараццa на прадпрыемствах Магілёва. Так, ужо створаныя ініцыятыўныя групы «Союза» на аб'яднанні «Хімвалакно» і заводзе «Сельмаш», а кіраўнікі гэтых прадпрыемстваў узначалілі абласны камітэт.

«Союзу» прысвячаюць паседжанні на ўзроўні аблвыканкама — так што гэтая рэч не менш важная, чым «бітва за ўраджай». У Магілёве, каб пераканаць саміх сабе ў тым, што «Союз» вельмі патрэбны, чыноўнікам давялося выслухаць дырэктара інстытута сацыялогіі НАН Беларусі Яўгена Бабосава, дэпутата лукашэнкаўскай палаты Валерыя Ліпкіна, рэктара Магілёўскага універсітэта Міхаіла Аўласевіча. Выступоўцы паміж іншым выказвалі спадзяванні, што з дапамогай гэтага «Союза» можна будзе паспяхова вырашаць нават эканамічныя пытанні.

Відаць, дзеля гэтага ж заснаваны фонд «Единение», у якім прадугледжана асабістае і калектыўнае членства. Заснавальнікі звярнуліся да ўсіх з заклікам далучацца да іх, а найперш пералічаць на гэта самае «Единение» грошы. Маючы на ўвазе досвед з БПСМ, можна меркаваць, што і члены, і грошы пацякуць у «Единение».

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Два мільёны рублёў — мінімум для першакласніка

«Як апрануць дзіця да школы?» — гэтае пытанне вырашалі ўдзельнікі чарговага «круглага стала», арганізаванага 1 жніўня ў Грамадскім прэс-цэнтры.

Абавязковая школьная форма была адмененая яшчэ ў 1991 г., і з таго часу прадпрыемствы перайшлі да вырабу школьнага адзення. Асноўныя патрабаванні да яго: сціпласць, але разам з прыгажосцю, адпаведнасць медычным нормам і, канешне, невысокі кошт.

Галоўная праблема для ўсіх вытворцаў адзення — стратнасць дзіцячага асартыменту. Дзяржава ўжо не датуе, як раней, выраб адзення для дзяцей. Таму прыбытку ад яго, як правіла, зусім няма, а патрабаванні — *«нават вышэйшыя, чым на Захадзе»*, як сказалі прадстаўнікі швейных фабрыкаў. Таму такія прадпрыемствы чакаюць, што ўрад пойдзе ім насустрач і адменіць некаторыя падаткі, напрыклад падатак на дабаўленую вартасць, каб у выніку можна было знізіць кошт прадукцыі.

Колькі будзе каштаваць школьнае адзенне? Кашуля ААТ «Дзяржынская швейная фабрыка «ЭЛІЗ» для хлопчыка каштуе 50—130 тысяч рублёў. Касцюм Баранавіцкай швейнай фабрыкі — 460—689 тысяч рублёў. Прыгожы дзявочы камплект Пінскага камбіната «Палессе» — 150—350 тысяч. Традыцыйная школьная сукенка брэсцкай фабрыкі «Надзея» — 180—270 тысяч. Трэба ўлічыць, што гэта толькі цэны вытворцаў, і да іх трэба дадаць гандлёвую надбаўку.

Кожнаму вучню яшчэ патрэбны партфель ці сумка. Іх вырабляюць на мінскім ААТ «Галантэя», і яны каштуюць ад 133 да 217 тысяч рублёў.

А ўвогуле, каб падрыхтаваць першакласнікаў да школы, па падліках спецыялістаў міністэрства гандлю, спатрэбіцца 2—2,5 млн. рублёў. У вас ёсць гэтая сума ў сямейным бюджэце?

Расціслаў ПЕРМЯКОЎ

Чым горш, тым лепш?

У камісіі па справах непаўналетніх г.Мазыра знайшлі спосаб выправіць сваё незайздроснае матэрыяльнае становішча. Для гэтага пры камісіі ствараецца пазабюджэтны фонд «Падлетак».

Сродкі ў фонд будуць даваць «дрэнныя» бацькі: сюды будуць пералічвацца 50% ад усіх штрафаў за невыкананне бацькамі сваіх абавязкаў і таксама 50% ад штрафаў за адміністратыўныя правапарушэнні падлеткаў. Такім чынам, чым больш будзе парушэнняў — тым больш штрафаў і грошай у камісіі.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Ці будзе Агата Мацко вучыцца на роднай мове?

У мінулую пятніцу ў судзе Ленінскага раёна Гродна разглядаўся іск жыхара горада Ю.Мацко, які патрабуе для сваёй дачкі магчымасці вучыцца на роднай мове.

Нагадаем: у 1990 годзе рашэннем Гродзенскага гарвыканкама школа № 10 была пераведзеная на беларускую мову навучання. Дачка Ю.Мацко Агата чатыры гады хадзіла ў беларускі клас. Але з мінулага навучальнага года адміністрацыя школы без усялякага папярэджання бацькоў увяла для дзяцей рускамоўнае навучанне.

Суд пачаўся даволі нервова: амаль на паўтары гадзіны спазніўся перакладчык. Юрась Мацко прапанаваў суду пачынаць працэс без перакладчыка, паколькі ён чалавек адукаваны і добра валодае і беларускай, і рускай мовамі. Аднак суддзя Таццяна Клімава адмовілася, бо сакратар суда беларускай мовы не ведае. Пасля таго, як суд урэшце распачаўся, пракурор Ірына Дзятчэня паспрабавала яшчэ раз высветліць — чаго ўрэшце дамагаецца ад суда Ю.Мацко. Той у сваю чаргу з годнасцю заявіў: *«Толькі таго, каб мая дачка вучылася на роднай мове»*. Пракурор апелявала, што ён адзіны з бацькоў, хто не хоча, каб яго ная дачка, як усе дзеці, вучылася па-руску. Мацко адказаў, што погляды і прынцыпы іншых бацькоў яго не цікавяць, а выбар мовы навучання для сваёй дачкі яму гарантуе Канстытуцыя Беларусі. Упартага бацьку спрабавалі пераканаць у тым, што ў дзяржавы сёння няма нават эканамічных магчымасцяў для такой адукацыі. У адказ яны пачулі, што дзяржава наша багатая і аб гэтым найперш сведчаць нядаўнія святы, якія праводзіліся ў гонар дня рэспублікі.

У якасці сведкі ў судзе выступала Валянціна Вільчэўская, дачка якой вучыцца разам з Агатай Мацко. Спадарыня Вільчэўская паведаміла, што яе ад самага пачатку задавальняла тое, што дачка мае магчымасць вучыцца на роднай мове. Аднак, з яе слоў, ужо з першага класа з боку настаўнікаў адчуваўся ціск на бацькоў: маўляў, усё роўна пасля пачатковых класаў яны будуць вучыцца па-руску. Так і сталася. Мінулым летам, перад пачаткам навучальнага года, класны кіраўнік сабрала сход з сямі бацькоў і паведаміла ім, каб тыя напісалі заявы аб пераводзе дзяцей на рускамоўнае навучанне. Але нават з гэтых сямі чацвёра адмовіліся. А з 1 верасня ўсе дзеці ў класе пачалі вучыцца па-руску.

Суд вынес рашэнне адкласці справу да 11 жніўня.

І яшчэ лічбы: з 27 беларускіх школ, якія існавалі ў Гродне ў 1994 годзе, сёння засталася толькі адна.

М.КАРНЕВІЧ

УДАКЛАДНЕННЕ

У мінулым нумары на 5-й старонцы надрукаваны здымак, адзін радок подпісу да якога па тэхнічных прычынах быў прапушчаны. Поўны тэкст подпісу:

Православная церковь низведена до уровня отраслевого министерства по делам верующих. Президент Лукашенко не стесняется указывать митрополиту Филарету, как и куда должна идти паства. И глава РПЦ Алексий II (на снимке слева) этому, похоже, нисколько не противится.

Прыносім прабачэнні нашым чытачам.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Наша акцыя

Асабістыя ўражанні ўдзельніка

Здаецца, асноўныя абставіны і акалічнасці наладжанай журналістамі акцыі ў абарону Шарамета ўсім ужо вядомыя. 31 ліпеня ў 15:30 ля будынка міністэрства замежных справаў сабралося каля 40 тэлерадыё-газетных карэспандэнтаў. На асфальце перад ганкам усёй талакой напісалі *«Свободу Паше, Диме, Славе!»* Кожны намаляваў па адной літары — каб каго-небудзь аднаасобна не абвінавацілі ў... цяжка сказаць, у чым — зрэшты, яны заўсёды знойдуць. Праскандавалі *«Свабоду Шарамету!»*, прайшліся з закладзенымі за галаву рукамі, у прыёмнай уручылі петыцыю са сваім пратэстам. Прыблізна тое ж самае з нязначнымі варыяцыямі паўтарылі каля будынкаў КДБ і Памежных войскаў.

Што характэрна, ніякай рэакцыі на нашы дзеянні не назіралася. Яшчэ каля МЗС падыйшоў нейкі сярэдні міліцэйскі чын, які на пэўнай адлегласці суправаджаў нас на працягу ўсёй акцыі, перадаючы нешта па рацыі. Ну і, вядома ж, «гэбэшныя» кінаапературы, якія беражліва захоўваюць для нашчадкаў кожны эпізод гісторыі беларускай вулічнай дэмакратыі.

Гэта, дарэчы, варта адзначыць, паколькі ў паведамленні прэс-службы МУС і потым на судах над журналістамі фігуруюць нейкія «неадназовыя папярэджанні» з боку супрацоўнікаў міліцыі, якіх на самой справе не было (ні міліцыі, ні папярэджанняў). Мяркуючы па далейшым развіцці падзей, відаць, у Мінску ёсць толькі адно «святое месца» для сілавых структураў — рэзідэнцыя прэзідэнта; каля астатніх можна рабіць што хочаш.

Мы, зрэшты, падазравалі, што каля адміністрацыі ўсё так проста не скончыцца. Ідзём, жартуем на гэты конт — *«напэўна, наступны пікет будзе ў абарону Цыганкова, Халіп, Шчукіна ды ўсіх удзельнікаў сёняшняй акцыі. А ўрэшце рэшт выйдзе апошні незалежны журналіст і будзе самотна патрабаваць: Свабоду ўсім!»* Дарэчы, няслушна, што падчас падобных акцый пануе нейкі гуллівы і безразважны настрой — унутраная напружанне безумоўна адчуваецца. За напускной весялосцю і індыферэнтнасцю хаваецца пытанне: «Калі пачнуць хапаць?» І выходзім мы на вуліцу не ад таго, што надта хочацца пашумець, а ад банальнага разумення «хто, калі не я?»

Ля будынка рэзідэнцыі «рэагаваць» пачалі адразу, як толькі мы сталі выводзіць першыя літары. Малюю сваё «в», бачу, як вырываюць крэйду з рук Ірыны Халіп, і думаю, ці паспею я скончыць сваю пісаніну. Тым не меней, напісалі і нават пракрычалі *«Свабоду Шарамету!»* — па-мойму, выключна з-за таго, што міліцыянты знаходзіліся ў пэўнай разгубленасці, не ведаючы, што рабіць. Праз некалькі хвілінаў падкаціла начальства (у форме і ў цывільнам), якое дало канкрэтную каманду: *«Усіх — на Маркса, 30»* — бліжэйшае аддзяленне РАУС.

Некаторыя журналісты, аднак, настойвалі на тым, каб перадаць петыцыю ў прыёмную рэзідэнцыі. Іх і пачалі хапаць першымі, запіхваючы ў «варанкі» — Мацкевіча, Чарткова, Шчукіна. Убачыўшы гэта, удзельнікі акцыі пачалі знікаць, «распаўзацца». Але «аперацыяй» ужо камандавалі спрактыкаваныя людзі ў цывільным, даўшы загад хапаць відэаапаратараў. Аператар кампаніі *WTN* Уладзімір Андронаў, уцякаючы, забег у бліжэйшыя дзверы, дзе яго дагналі пяцёра. Двое цягнулі на сябе відэакамеру, трэці біў па спіне. *«Вы не маеце права, я акрэдытаваны як замежны карэспандэнт»*, — крычаў журналіст, на што «стрыжаныя» малацэнзурнай лексікай тлумачылі, у якой краіне ён жыве.

«Что вы стоите — хватайте этих сучек!» — пасля гэтай каманды «стрыжаныя» пачалі адлоўліваць жанчын. Людміла Маслюкова прабегла метраў 50, прымусіўшы «цывільных» прадэманстраваць сваю фізічную падрыхтоўку; Ірыну Халіп злавілі ўжо фактычна ў метро. Усяго было затрымана 15 чалавек, астатнія паспелі ўцячы...

А я ўсё не магу забыць гэтыя чырвоныя ад напружання, навостраныя, як у гончых, твары «стрыжаных», іхняе нервовае жаданне хутчэй бы рвануць «у бой, у справу». «Мы хацелі біць, біць, біць...» — перадаў калісьці Юрый Малумаў свае ўражанні ад знаходжання у міліцэйскім ланцугу падчас масавых мерапрыемстваў. Але якую пагрозу маглі ўяўляць 30—40 журналістаў, сярод якіх палова — жанчыны? У чым экстрэмальнасць гэтай сітуацыі, дзе прычына для нараджэння агрэсіўных пачуццяў? Я хачу знайсці апраўданні злым і перакошаным тварам «стрыжаных» — і не знаходжу іх. Надта лёгка, без якой-небудзь сур'ёзнай знешняй прычыны, пераходзяць яны тонкую мяжу ад звычайнага чалавечага стану ў нейкі іншы, якому лепей не шукаць вызначэнняў. Надта лёгка яны гатовыя скінуць усё на «загад» і «абставіны», а потым распавядаць сваім дзецям — «час быў такі»...

Віталь ЦЫГАНКОЎ

Журналісты хадзілі каля будынка КДБ, залажыўшы рукі за галаву.

Заявление Президиума Верховного Совета Республики Беларусь

В суверенной Беларуси борьба правящего режима с прессой вступила в новую фазу. За выполнение журналистами своих профессиональных обязанностей и стремление объективно освещать ситуацию в Республике Беларусь их задерживают, избивают, устраивают над ними судилища. При этом власти совершенно не считаются с Конституцией и законами, демонстрируют пренебрежение к общепринятым нормам международнага права, открыто нарушают права и свободы граждан. <...>

Президиум Верховного Совета Республики Беларусь обращается к руководителям государств и парламентов мира с просьбой выразить свое отношение к происходящему в Беларуси и содействовать всеми доступными методами восстановлению законности, демократии и прав человека в Республике Беларусь.

Председатель Президиума Верховного Совета Республики Беларусь С.Г.Шарецкий
1 августа 1997 г., г.Минск

ПИСЬМО В РЕДАКЦИЮ

Медвежьи методы не помогут

То, что Павел Шеремет вызывает у президента явно отрицательные эмоции, было видно давно. Но что в качестве средства для усмирения «нечестного» журналиста будет использован Уголовный кодекс — как-то не верилось. Все-таки приближаемся к 21-му столетию и живем в центре Европы. Тем не менее — свершилось.

Первую информацию об «опасном преступнике» Шеремете по белорусскому телевидению прокомментировал сам командующий пограничными войсками в чине генерала. Из нее следовало — П.Шеремет по предварительному сговору с группой лиц умышленно совершил незаконное пересечение Государственной границы Республики Беларусь, т.е. совершил преступление по ч.2 ст. 80 Уголовного кодекса, предусматривающей наказание в виде лишения свободы до пяти лет с конфискацией имущества. В следующем выступлении на эту тему офицера КГБ чином пониже содержались намеки и на более серьезный «криминал»: посягательство на государственную безопасность, обороноспособность, государственную тайну. В завершение миловидная ведущая «Панорамы» возмутилась чрезмерной мягкостью наказания, грозящего его коллегам, и потребовала его ужесточения. Видимо, вплоть до смертной казни.

Последующие выступления по этому поводу представителей власти различного уровня ясности не внесли, а лишь затуманили дело еще более расплывчатыми формулировками типа «демонстративная и вызывающая провокация».

Вспомнилось нечто похожее, случившееся ровно девять месяцев назад. Правда, место действия другое — город Могилев, но сущность та же. Органами внутренних дел в Могилеве был задержан опасный преступник Кравченко Н.Н. за совершение действий, грубо нарушающих общественный порядок и отличающихся особой дерзостью, а именно — за распространение газеты «Грамадзянін» и текста обращения экс-министра внутренних дел Захаренко Ю.Н. к сотрудникам милиции. Кравченко (кстати, майор милиции в отставке) тогда тоже был брошен за решетку. Лишить свободы Кравченко хотя бы на несколько дней надо было обязательно в силу его «особой опасности» для общества. И хотя уголовное дело Кравченко впоследствии было прекращено за отсутствием состава преступления, никто не ответил за тот цинизм, с которым нарушали права Кравченко, за те моральные страдания, которые ему пришлось перенести. Такая же история повторится скорее всего и с Шереметом. С 1984 года я занимаюсь расследованием уголовных дел, рассмотрением их в суде, сейчас — анализом состояния преступности в республике, и могу с уверенностью сказать, что дело Шеремета шито белыми нитками.

Возмущает и другое. Такая сложная криминогенная обстановка в стране, переполнены тюрьмы и колонии, на свободе находятся действительно опасные насильственные преступники, а правоохранительным органам больше нет дел, как только бороться с журналистами. На проблему Светлогорска, почти уничтоженного наркоманией и СПИДом, уже не остается ни времени, ни сил. Вот это, господин Шейман, и есть проблема государственной безопасности номер 1!

И последнее. Известный русский писатель М.Е.Салтыков-Щедрин, тоже, кстати, пострадавший за «вредный образ мыслей», написал замечательную сказку «Медведь на воеводстве». Герой сказки медведь, назначенный на воеводство, для поправки своей репутации забрался ночью в типографию, станки разбил, шрифты смешал, а произведения ума человеческого в отхожую яму свалил. Но ничуть ему это не помогло.

И.В.КУЧВАЛЬСКАЯ,
кандидат юридических наук

ДАГЕРОТИП

Кто кому будет объяснять – Лукашенко Ельцину или наоборот?

Семен БУКЧИН

Журналист — профессия шпионская

Сначала о сути конфликта. Говорят, что Павел Шеремет «нарывался», провоцировал и без того подорвавшего нервную систему «батьку». Если и так, то это личное его, Шеремета, дело. Мне интересно другое. Начитавшийся еще в далекой юности советских повестей и романов, насмотревшийся соответствующих фильмов о коварных нарушителях границы и доблестных ее стражах с преданными Мухтарами, я хочу знать, как именно коллега Шеремет переходил границу. Переползал ли он контрольно-следовую полосу, сжимая в зубах ножницы для резки колючей проволоки? Или надевал специальную обувку с коровьими копытами на подошве?

Увы — ни того, ни другого не было. Троица с ОРТ приехала на некий белорусско-литовский переходный пункт и прогулялась, засвидетельствовав провинциальную патриархальность пограничных нравов, никак не соответствовавшую железным уверениям кровного союзника России, что граница нового Союза «на замке». Г-н Шеремет и ранее портил кровь г-ну Лукашенко. А этим репортажем по ОРТ попросту заложил его перед Россией, которую ведь еще доить и доить надо, в том числе и на пограничные нужды.

Ну и взыграло ретивое у «батьки»! А у нас это означает одно — в тюрьму. Только когда человек в тюрьме, батьке становится легче. Отпускает.

Сегодня Лукашенко утверждает, что Павел Шеремет — шпион. И я с этим полностью согласен. Шпионство, влезание туда, куда не просят, где что-то скрывают, — суть профессии журналиста. Как и тяга к сенсации. А как иначе предупредить общество, рассказать правду, если власти стремятся эту правду утаить? Вот и идет игра: власти скрывают — журналисты раскрывают. В цивилизованных странах соблюдают правила этой игры. В тоталитарных государствах за одну только попытку поиграть — сажают в тюрьму. Тоталитарный режим всегда туп и понимает журналистику только как средство передачи той информации, которую он сам дозирует.

Время Расплюевых

Когда я неоднократно смотрел по ТВ, как демократичный Ельцин искренне возмущался — понимаешь! — самоуправством Лукашенко, посмевшего арестовать журналистов ОРТ, а на следующий день лицезрел «достойную отповедь» нашего правителя, мне всё вспоминалась сценка из какой-то старой русской пьесы. И вот вспомнил: «Смерть Тарелкина» Сухово-Кобылина.

Там купец Попугайчиков вообразил, что эпоха «великих реформ» освободила его от вымогательств полиции. Но пройдоха Иван Расплюев, потребовав его в «секрет» (полицейскую каталажку), рассеял эти иллюзии. Он так и говорит: *«А в чем же, Антиох Елпидифорыч, наше время прошло? Врешь, купец Попугайчиков, не прошло еще наше время!»*

Ельцин, такой себе новоявленный Попугайчиков, твердит, что теперь, мол, демократия. Что Россия теперь еврочлен, а потому Беларуси, как части российско-белорусского союза, нужно вести себя соответственно. Культурно. Во всяком случае, не сажать журналистов в ту же каталажку.

На что опытнейший Иван Антоныч Расплюев, он же Лукашенко, справедливо отвечает, что времена те же и что Ельцину-Попугайчикову об этом отлично известно. А чтобы президент уважаемого братского государства в этом не сомневался, взял да и затащил в милицию группу белорусских журналистов, выражавших протест в связи с арестом коллег. Такой вот своего рода «наш ответ Чемберлену». Не сомневайся, мол: сажали и будем сажать! И тебе советуем делать то же самое, порядок у себя наводить с разболтавшимися СМИ!

А как отличилась пресс-служба нашего правителя! Это же надо — такой отлуп дать Кремлю! Сам Пазьняк, небось, кусает губы от зависти за границей. Так и заявили: нечего на нас топать и орать с кремлевских высот, мы теперь сами с усами! Суверенные. И нечего пугать нас пересмотром устава Союза. Мы и сами можем пересмотреть. Развернемся к вам задом, к *NATO* передом — тогда и поймете, что такое граница Московского княжества под Смоленском. Трубы ваши газовые на Запад перекроем, шоссейку на Брест завалим под Оршей. То-то запоете! Тогда вам, Расее, совсем кранты!

Поэтому либо принимайте и перенимайте белорусские порядки, либо...

Такая вот дилемма. Расплюев теперь во власти. Его время. Он и не стыдится, когда заявляет: «... *вот этих петличек дрожал, а теперь меня дрожать будут! Раболепствовать будут!»*

Как доказать преданность Хозяину

Когда все тихо, как докажешь, что верно служишь Хозяину? Вот и появляются сомнения, и Хозяин на всякий случай велит полить верного слугу грязцой: вытерпит или бунтовать станет? Вытерпит — значит станет пуще прежнего служить. И не ошибся. Утерся, выждал, а тут и случай подоспел доказать свою преданность.

Официальная пресса и телевидение буквально заходятся в обличительном раже. Эти «Онэксимбанки», эти «Мосты», эти Гусинские и Березовские, эти Доренко и Киселевы — какая продажность, какой цинизм в журналистской среде! Все покупается и продается! То ли дело у нас. Один Хозяин все государство забрал в свою же собственность — и никакой борьбы: перед каждым из обслуги своя миска с похлебкой. Зачем драться?

Вот главный редактор «Советской Белоруссии» по-государственному мудр и подает хорошие советы: «... будем надеяться, что официальные власти учтут все обстоятельства, в том числе и молодость Павла Шеремета...»

Шеремет действительно молод, и сидение в лукашенковской тюрьме — не самый худший штрих в его журналистской биографии. Настоящая журналистика — это не тот случай, когда солдат спит, а служба идет.

Все будет о'кей!

Те, кто сильно напугался, пусть успокоятся: не будет никакого разрыва отношений между Беларусью и Россией. Они еще будут целоваться, Ельцин и Лукашенко. Эти ельцинские нахмуренные брови и упрямое «понимаешь» — так, понарошку. Для Запада, в основном. Показывает дядя Боря, что он, мол, на страже демократических ценностей и этого заравшегося Лукашенку намерен одергивать. Пьеска такая разыгрывается.

И белорусский правитель вместе с обслугой хорошо ему подыгрывают. Мол, не сам он до всего этого додумался, а злые бояре Чубайс с Немцовым нашептали. Завели, так сказать, старичка.

Теперь дело за малым — правильную информацию донести. Тут-то и выяснится, что никаких противоречий нету. И опять пойдет пир горой. Законы будут всякие сочинять, как еще лучше объединиться, бумаги разные подписывать.

И целоваться, целоваться без конца. Пока молодой старого не удушит в объятиях.

По-другому и быть не должно. Иначе зачем со стариком-то?..

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Яднанне беларусаў спыніць нельга

Пасля закрыцця Другога з'езду беларусаў свету ў афіцыйных сродках масавай інфармацыі настойліва гаварылася, што на з'ездзе адбыўся раскол. Па каментары карэспандэнт СВАБОДЫ звярнулася да старшыні Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» Ганны СУРМАЧ.

— З'езд завяршыўся спакойна, не было зроблена афіцыйных заяваў ад суполак, што яны выходзяць з «Бацькаўшчыны» або пратэстуюць. Мы стараліся даць слова людзям розных поглядаў. У зале былі прадстаўнікі ад розных грамадскіх сілаў. Не дзіўна, што выступленні ўспрымаліся па-рознаму, але гаварыць пра раскол падставаў няма.

— Прэзідэнт Лукашэнка заявіў, што ён хацеў вам даць меншае памяшканне, чым вы прасілі, каб сабраліся толькі прадстаўнікі дыяспары?

— З гэтай заявы прэзідэнта стала відавочна, што менавіта ён вырашаў пытанне з памяшканнем і што менавіта праз яго З'езд мог быць сарваны.

Мне незразумелая сама пастаноўка пытання, што можна было правесці З'езд у меншай зале. Мы праводзілі не прыватную нараду, а З'езд беларусаў свету. І варта нагадаць, што Першы З'езд адбываўся ў Оперным тэатры і на ім прысутнічала каля паўтары тысячы чалавек.

— Днямі быў апублікаваны зварот часткі ўдзельнікаў З'езду, дзе выказваецца недавер «Бацькаўшчыне» і выкладзена прапанова стварыць іншую арганізацыю для працы з замежжам. Як Вы ставіцеся да гэтага?

— Лічу, што кожны мае права належаць да таго грамадскага аб'яднання, якое яму падабаецца, ці ініцыяваць стварэнне новай структуры. Мяне толькі дзівіць, чаму ў такой сітуацыі звяртаюцца да дзяржаўных структураў, бо гэта практыка савецкіх часоў.

Непрыстойна, на маю думку, выглядае ганьбаванне ў заяве Згуртавання «Бацькаўшчына». Менавіта мы запрасілі іх у Мінск, кожнага прывецілі, клапаціліся пра месца пражывання і харчаванне. Дый на працягу чатырох гадоў нямала добрага зрабілі для многіх. Можа быць, па гэтай прычыне яны і не адважыліся выступіць супраць «Бацькаўшчыны» на самім З'ездзе, дзе трэба было глядзець нам у вочы, а спакусіліся на абяцанкі дзяржаўных чыноўнікаў ужо па-за рамкамі З'езду.

Тыя людзі, хто падпісаў заяву, складаюць зусім маленькую частку ад агульнага складу беларускай замежнай грамады.

— Асобных прадстаўнікоў дыяспары пасля з'езду запрасіў Лукашэнка. Для чаго?

— Людзі пайшлі паслухаць прэзідэнта і выказаць свае думкі. Шкада толькі, што гэтую сустрэчу аднабакова, тэндэнцыйна паказалі па тэлебачанні, як і ўсю работу З'езду. Менавіта «Бацькаўшчына» стварыла для прэзідэнта магчымасць сустрэцца з прадстаўнікамі дыяспары. Аднак мы не толькі не пачулі ад яго падзякі, але і, наадварот, ім было зроблена ўсё магчымае, каб стварыць негатыўны вобраз нашай арганізацыі перад беларусамі замежжа. Прэзідэнтам было заяўлена: «Вельмі рады, што вы ўбачылі твар маёй апазіцыі. Мне вельмі было сорамна за вас. Я зразумеў, што вы не можаце з'ехаць, не сустрэўшыся са мной... За гэта арганізатары адкажуць. Адкажуць паводле закона. У мяне дастаткова ўлады, каб яны адказалі.. Тэатр музычнай камеды — ператварылі з'езд у камедыю. Я абяцаю, што я выпраўлю гэтую памылку. Камеды больш не будзе...»

Мэтанакіраваны разбуральны працэс, распачаты ў краіне супраць усяго нацыянальнага, дайшоў і да нас. «Бацькаўшчыне» на Бацькаўшчыне можа не быць месца. Але працэс яднання беларусаў свету прыпыніць нельга. Гэта дае нам надзею.

Гутарыла
Людміла ЧАПРОЎСКАЯ

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Хлусня высокага ўзроўню

Выклікае абурэнне вельмі тэндэнцыйнае, неаб'ектыўнае асвятленне афіцыйнымі сродкамі масавай інфармацыі II З'езда беларусаў свету, што адбыўся 26—27 ліпеня ў Мінску. Напрыклад, паведамлялася аб сустрэчы прэзідэнта Лукашэнкі з дэлегатамі. Але застаецца загадкай: хто і з якімі мэтамі быў паклікан, дзе гэтая сустрэча праводзілася. Здзіўляюць выказванні самога А.Лукашэнкі, які на з'ездзе не прысутнічаў ні хвіліны. Абразай у адрас нацыянальнай эліты прагучалі ягоныя словы, што на фоне «высакароднасці і чысціні» зусім інакш выглядаюць прадстаўнікі апазіцыйных партый Беларусі. Што да чаго? На з'ездзе аніякага падзелу на партыі і рухі не было. Як удзельнік з'езда ўпэўнена сцвярджаю, што ўся атмасфера была споўнена галоўным клопатам: асновы беларускага этнасу і самастойная беларуская дзяржаўнасць — у смяротнай небяспецы.

Прэзідэнт імкнецца раз'яднаць беларусаў — і гэта відавочна. Ён, бач ты, «папрасіў» не ўспрымаць адносіны, панаваўшыя на з'ездзе, як *«адносіны ўсяго народа, які пражывае на беларускай зямлі, да сваіх суайчыннікаў за мяжой»*. Ізноў хлусня! На з'ездзе панавала павага да ўсіх гасцей, усіх беларусаў замежжа.

Зрэшты, неэтычныя выпады прэзідэнта ў бок нацыянальных сілаў ужо не дзівяць. Але здзіўляе і выклікае неўразуменне публікацыя «зварота да прэзідэнта, парламента, народа Рэспублікі Беларусь» (газета «Звязда», 30 ліпеня), у якім ухваляюцца «намаганні» А.Лукашэнкі *«па аб'яднанні славянскіх і брацкіх народаў на постсавецкай прасторы»*, аблайваецца «заходняя дэмакратыя», абвінавачваецца Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», выказваецца ганьба ў адрас «нацыяналістаў-адшчапенцаў», што прадаліся за «зялёны долар». Там жа робяцца адпаведныя заклікі: *«зрабіць усё магчымае для паскарэння працэсаў інтэграцыі», «узмацніць барацьбу супраць NATO», «стварыць сапраўднае народнае таварыства беларусаў»* і інш.

Цікава, што гэтыя «зварот» пададзены ад імя невядомых прадстаўнікоў беларускіх абшчын Прыдняпроўя, Мурманска, рэспублікі Комі, Масквы, усходняга рэгіёна Украіны, Чарнігаўскай і Івана-Франкоўскай абаласцей, Кыргызстана. І — ніводнага прозвішча! Няма і паведамленняў, колькі тых прадстаўнікоў ды хто яны і ці адпавядае гэты зварот думцы абшчын. Гэта — не дробязі! Бо з зусім іншымі, поўнасцю супрацьлеглымі заявамі адкрыта і рашуча выступалі на з'ездзе іншыя прадстаўнікі з Масквы, Украіны, Малдовы.

Таму само сабою ўзнікае пытанне: а ці не папрацавалі з «заяўленцамі» адпаведныя службы А.Лукашэнкі, якія ўжо былі гатовы для сустрэчы менавіта з тымі «прадстаўнікамі»? Вельмі пазнавальныя слоўныя пасажы наконт NATO, заходняй дэмакратыі, вяртання да новага СССР. Яны не маюць аніякага дачынення да з'езда, але якраз супадаюць з бясконцымі выказваннямі А.Лукашэнкі.

І ні я, ні адзін другі беларус з «Бацькаўшчыны» не атрымалі ні аднаго цэнта за сваю «прадажнасць». «Прадаліся за зялёныя» — абыходкавы тэрмін з лексікона «ўсенародна любімага», так што можна думаць, што тэкст «звароту» пісаўся адпаведнымі службамі ў Мінску, а падпісанты збіраліся сапраўды за грошы. Таму яны і не пажадалі назваць сябе.

Аляксей САЛАМОНАЎ,
прафесар, удзельнік II З'езда беларусаў свету

Канец валютнай стабільнасці

Курс беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША на мінулым тыдні ў чарговы раз імкліва паляцеў уніз.

Рэальны курс долара на пазабіржавым рынку больш за месяц не перавышаў 31—32 тысячы рублёў. Аднак у другой дэкадзе ліпеня курс долара паступова стаў расці. На мінулым тыдні тэмпы росту рэзка павялічыліся і курс пераваліў мяжу 35.000 рублёў за долар. На рынку наяўнай валюты «чорныя» каціроўкі дасягнулі амаль 31.000 рублёў за долар.

Эксперты адзначаюць, што асноўнай прычынай гэтага стала перш за ўсё падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі, якая заўсёды патрабавала вялікай колькасці грошай. На сельскую гаспадарку будзе выдаткавана 3 трлн. рублёў, да таго ж яшчэ 1 трлн. рублёў будзе накіраваны на жыллёвае будаўніцтва. Гэтых велізарных сум незабяспечаных грошай больш чым дастаткова, каб істотна падняць рынкавы курс долара. Да таго ж, Нацбанк прыняў рашэнне абмежаваць аперацыі ў беларускіх рублях з нерэзідэнтамі (замежнымі фірмамі і банкамі). Хоць за гэтым крокам яўна стаіць спроба ўзяць пад кантроль пазабіржавы валютны рынак, дзе актыўна працуюць нерэзідэнты і курсы рубля істотна адрозніваюцца ад афіцыйных, адзінае, чаго пакуль удалося дасягнуць Нацбанку, — гэта рэзкі рост курса долара.

Чакаецца, што курс долара ў бліжэйшы час будзе расці, калі толькі ўлады не зменяць свае планы ў адносінах эмісій. Аднак большасць удзельнікаў валютнага рынку лічыць, што перыяд стабільнасці курса рубля, што цягнуўся некалькі летніх тыдняў, ужо скончыўся.

Алесь САДОЎСКІ

СТРАДА



Грошай хапае толькі на хлеб і гарэлку

Міністэрства гандлю 30 ліпеня падвяло вынікі сваёй працы за першае паўгоддзе. Сваёй асноўнай заслугай, якая *«красамоўна адлюстроўвае агульныя пазітыўныя зрухі ў эканоміцы»*, працаўнікі міністэрства гандлю лічаць павелічэнне тавараабароту на 20% у параўнанні з першым паўгоддзем мінулага года. Праўда, мінгандляры адзначылі заслугі і іншых галінаў: у прамысловасці вытворчасць харчовых тавараў павялічылася на 17%, а нехарчовых — на 32%. Усё гэта, вядома ж, паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі.

Было адзначана, што пры некаторым паляпшэнні структуры тавараабароту, г.зн. павялічэнні аб'ёмаў продажу нехарчовых тавараў, доля харчовых тавараў у рознічным тавараабароцеўсё яшчэ складае значную частку — 65,9% (што з'яўляецца несумнеўнай прыкметай гранічна нізкага ўзроўню даходаў, якіх хапае ў асноўным толькі на набыццё прадуктаў харчавання).

Што датычыцца структуры спажывання, то тут таксама адзначаныя некаторыя змены, якія зусім не сведчаць аб *«пазітыўных зрухах у эканоміцы»*, — людзі сталі менш спажываць малочных і мясных прадуктаў, але больш ядуць хлеба і хлебабулачных вырабаў. Паралельна з гэтай тэндэнцыяй растуць вытворчасць і спажыванне алкагольнай прадукцыі (61% усіх магазінаў у краіне гандлююць спіртным). Захаванне такой сітуацыі ў будучым немінуча прывядзе да «співання» беларускага народа на фоне недахопу сродкаў на больш-менш нармальнае харчаванне. Цікава, што супрацоўнікі мінгандлю бачаць вырашэнне праблемы ў тым, каб зрабіць парадак выдачы дазволаў на гандаль спіртным яшчэ больш жорсткім.

У сувязі з істотным перавышэннем рэальнага ўзроўню інфляцыі над запланаванай урадам велічынёю ў гандлі рэзка абвастрылася сітуацыя з цэнаўтварэннем. Рост адпускных цэнаў прадпрыемстваў-вытворцаў пры зафіксаваных на адным узроўні гандлёвых надбаўках (у сярэднім па гандлі ў першым паўгоддзі 1997 года гандлёвая надбаўка складае 19%, на асноўную групу прадуктаў харчавання — 10—15%) прывёў да падзення ўзроўня рэнтабельнасці прадпрыемстваў гандлю да недапушчальна нізкага ўзроўню —1%. Падыход мінгандлю да вырашэння гэтай праблемы таксама даволі цікавы: пасля 10-гадовага перапынку аднаўляецца практыка правядзення конкурсаў прафесійнага майстэрства сярод лепшых прадаўцоў прадпрыемстваў гандлю ўсіх формаў уласнасці. Хлеб і гарэлку будуць прадаваць лепш!

Вераніка СТРОЕВА

Урожай будем собирать долго

Правительство рассчитывает в этом году получить 6,4 млн. тонн зерна, что на 1 млн. тонн больше, чем в 1996 г.

Однако на специально проведенном на прошлой неделе совещании с участием президента отмечалось, что условия уборочной традиционно осложнены. На этот раз — *«высокой полеглостью и засоренностью посевов»*. Кроме того, *«самое узкое место на селе сегодня — это низкая пропускная способность зерноуборочных комбайнов из-за высокого износа»*, — витиевато, но вполне конкретно заявил министр сельского хозяйства В.Леонов на пресс-конференции.

Деньги на ветер

Государственные дотации вылетают в трубу из-за фиксированных тем же государством цен: получив в виде государственных дотаций в этом году 6 трлн. рублей, по причине сдерживания цен крестьяне потеряют около 30 триллионов рублей. В этой связи, как считает Василий Леонов, неизвестно, кто кому должен — село государству или все-таки государство селу.

На сегодняшний момент в стране 500 убыточных хозяйств, от поддержки которых государство отказалось. Леонов тем не менее против введения процедуры банкротства (так как ни в одной отрасли экономики она не введена) и предлагает в очередной раз отсрочить долги этих хозяйств. Отсрочить достаточно 500 млрд. рублей. Задолженность же государства по зарплате этим хозяйствам только за май составила 100 млрд. рублей. В целом по селу на сегодняшний день не выплачено еще 400 млрд. рублей зарплаты.

Сколько стоит уборочная?

В этом году из бюджета село получило порядка 6 трлн. рублей. Госзаказ на 1,7 млн. тонн зерна по 150 долларов США за тонну оплачен примерно на 75%. Для создания государственного резерва правительство дало распоряжение «Беларусбанку» выделить около 1 трлн. рублей.

По прогнозам специалистов минсельхозпрода, увеличение в этом году урожая зерна на 1 млн. тонн по сравнению с предыдущим годом позволит снизить закупки за рубежом до 200—300 тысяч тонн (импорт зерна необходим для того, чтобы поднять производство мяса и молока).

Учитывая же, что на юге России и Украины в этом году довольно высокий урожай зерновых, минсельхозпрод рассчитывает несколько сбить цены на закупаемую продукцию, за счет чего повысить обьемы импорта. Благодаря увеличению закупок можно будет произвести больше мясной и молочной продукции и затем продать ее той же России, надеются работники министерства.

Что касается такого больного вопроса, как производство сахара, министр отметил, что в этом году урожай сахарной свеклы вырастет на 200 тысяч тонн по сравнению с прошлогодним. Таким образом, на 1/3 Беларусь сможет самостоятельно обеспечить себя сахаром, обещает министерство сельского хозяйства.

Вероника СТРОЕВА

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
5 жніўня 1997 г., № 84

Уладзімір АРЛОЎ, Генадзь САГАНОВІЧ

Дзесяць вякоў беларускай гісторыі

Беларусь у Расейскай імперыі

1914. Пачатак Першай сусветнай вайны

Гэта была вайна за перадзел ужо падзеленага свету паміж нямецка-аўстрыйскім блокам дзяржаваў і Антантай (Англіяй, Францыяй і Расеяй). Зачэпкаю для яе пачатку сталася забойства сербскімі тэрарыстамі спадкаемца аўстра-вугорскага трона эрц-герцага Франца Фердынанда. 19 ліпеня (1 жніўня) вайну Расейскай імперыі абвясціла Нямеччына, а праз пяць дзён — Аўстра-Вугоршчына.

У кампанію 1915 года галоўны ўдар сваіх армій Нямеччына скіравала супроць Расеі. У сувязі з гэтым у жніўні быў створаны Заходні фронт са штабам у Менску. Беларусь зрабілася прыфрантавой паласой. Тут скарачалася прамысловая вытворчасць, пасяўныя плошчы і пагалоўе жывёлы. Блізу паловы мужчын былі змабілізаваныя. Сотні тысяч жыхароў, часцей за ўсё пад прымусам, сталі бежанцамі.

У выніку летняга нямецкага наступлення расейскія войскі пакінулі Варшаву, а потым Коўна, Берасце і Горадню. У верасні нямецкае кавалерыйскае злучэнне ў складзе шасці дывізій прарвала фронт на ўчастку Свянцяны—Барысаў, захапіла Вілейку і наблізілася да Маладзечна. Асобныя часткі дайшлі да Барысава і Смалявічаў. Была пакінутая Вільня. Аднак 2-я расейская армія здолела пасля жорсткіх дзесяцідзённых баёў у ваколіцах Маладзечна, Вілейкі і Смаргоні разбіць праціўніка. Немцы адступілі да азёраў Нарач і Свір, пасля чаго бакі перайшлі да пазіцыйнай вайны, і фронт на доўгі час усталяваўся на лініі Дзвінск (Даўгаўпілс) — возера Нарач — Баранавічы — Пінск.

Паводле дамовы з хаўруснікамі расейскае камандаванне меркавала правесці улетку 1916 года шырокае наступленне, але, каб дапамагчы французскай арміі, якая трапіла ў цяжкае становішча пад Вердэнам, аперацыя пачалася раней, ў сакавіку, на вузкім участку фронту каля возера Нарач. Наступ разгарнуўся пры слабой падтрымцы артылерыі і ў складаных метэаралагічных умовах. Нарачанская аперацыя была непадрыхтаваная і, нягледзячы на гераізм расейскіх салдатаў, дала толькі нязначныя тактычныя поспехі. Страты Расеі забітымі, паранENымі і палоннымі склалі блізу 100 тысяч чалавек. Такі кошт быў заплочаны за палёгку, атрыманую французскай арміяй.

Цяжкія паразы, дрэннае забеспячэнне правіянтам і боепрыпасамі вялі ў арміях Заходняга фронту да росту незадаволенасці і салдацкіх выступленняў. Сама моцнае з іх адбылося ў кастрычніку 1916 года ў Гомелі. Штуршком да яго стаў арышт казака М. Башкіна, якога турэмшчыкі жорстка збілі. У адказ на гэта паўсталі чатыры тысячы салдатаў і казакоў, якія абяззброілі вартавых, вызвалілі з гаўптвахты 800 арыштаваных і знішчылі абвінаваўчыя дакументы.

Пасля кастрычніцкага перавароту салдаты Заходняга фронту адыгралі галоўную ролю ва ўсталяванні бальшавіцкай улады на неакупаваным немцамі абшары Беларусі.

3 сакавіка 1918 года ў Берасці была падпісаная мірная дамова паміж Савецкай Расеяй і дзяржавамі нямецкага блоку. Паводле гэтай дамовы нямецкія войскі акупавалі Польшчу, Летуву і частку Беларусі.

Першая сусветная вайна прынесла беларускаму народу велізарныя людскія страты. Загінула 1 млн. 200 тыс. чалавек, сотні тысяч беларусаў не змаглі вярнуцца з эвакуацыі, засталіся параскіданымі на неабсяжных абшарах Расеі.

У.А.

5 (18) снежня 1917. Адкрыццё Першага Усебеларускага з'езда



У будынку, дзе праходзіў З'езд, сёння месціцца Купалаўскі тэатр.

Падзеі 1917 года спрыялі згуртаванню нацыянальных арганізацый, якія аб'ядналіся ў Вялікай Беларускай Радзе. Дзеля вызначэння далейшага лёсу Беларусі Рада склікала ў Менску Усебеларускі з'езд (кангрэс).

Такога прадстаўнічага сходу не здолеў у тым часе сабраць ніводны паняволены народ колішняй Расейскай імперыі. На кангрэс з'ехаліся 1872 дэлегаты з усяго беларускага этнічнага абшару — ад Смаленшчыны да Беласточчыны. Апрача дэлегатаў ад мясцовага жыхарства на з'ездзе прысутнічалі прадстаўнікі беларусаў, якія служылі ў войску і на флоце, а таксама беларусаў-бежанцаў, што мусілі пакінуць Бацькаўшчыну ў сувязі з вайной. Старшынёй кангрэса быў абраны прафесар Іван Серада.

На з'ездзе прагучаў заклік «Няхай жыве Беларуская Народная Рэспубліка!». Дэлегаты падзяліліся на тых, хто змагаўся за поўную незалежнасць, і тых, хто выступаў за аўтаномную дэмакратычную рэспубліку ў складзе Расеі. Другая прапанова мела значна больш прыхільнікаў і была прынятая.

Удзельнікі кангрэса выказалі трывогу з тае прычыны, што Троцкі вядзе ў Берасці перамовы пра мір з немцамі без уліку інтарэсаў Беларусі. Дэлегаты выказалі недавер кіраўніцтву Заходняй вобласці (так Беларусь называлі бальшавікі). З трыбуны з'езда неаднаразова гаварылася, што выканаўчы камітэт Заходняй вобласці не можа прадстаўляць беларускі народ, бо ў ягоным складзе бальшыню маюць не мясцовыя жыхары, а вайскоўцы з дыслакаваных на Беларусі часцінаў расейскай арміі.

Запрошаныя на кангрэс камуністы ад удзелу ў ім ухіліліся, але пільна сачылі за падзеямі. Так званы Паўночна-Заходні абкам РСДРП(б), на чале якога тады быў А. Мяснікоў, не прызнаваў не толькі права беларусаў на самавызначэнне, але нават самога факта існавання беларускай нацыі. Убачыўшы, што на з'ездзе няўхільна набіраюць вагу незалежніцкія настроі, бальшавікі пастанавілі разагнаць яго з дапамогаю сваіх узброеных аддзелаў. Дэкрэт аб разгоне падпісаў старшыня Савета народных камісараў Заходняй вобласці К. Ландар.

З'езд вымушаны быў спыніць свае паседжанні, частку дэпутатаў бальшавікі арыштавалі. Але прытулак удзельнікам кангрэса далі менскія чыгуначнікі, пад аховаю якіх была абраная Рада і Выканаўчы (Спаўняючы) Камітэт Усебеларускага з'езда. Выканкам узначаліў адзін з кіраўнікоў Беларускай Сацыялістычнай Грамады Язэп Варонка.

18 лютага 1918 года пачаўся наступ нямецкіх войскаў. Праз дзень бальшавікі ўцяклі з Менска і Выканаўчы Камітэт выйшаў з падполля. У сваёй 1-й Устаўной грамаце ён абвясціў сябе ў Беларусі часоваю ўладай і ўзяў курс на скліканне Усебеларускага Установчага Сойма на аснове агульнага выбарчага права.

1-Я УСТАЎНАЯ ГРАМАТА ДА НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ

Родная старонка наша апынулася ў новым цяжкім стане. Дзе цяпер улада, што была тут, няведама, мы стаімо перад тым, што наш край можа быць заняты нямецкімі войскамі.

Мы павінны ўзяць свой лёс ва ўласныя рукі. Беларускі народ павінен зьдзейсьніць сваё права на поўнае самаазначэньне, а нацыянальныя меншасьці на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію.

Правы нацыі павінны знайсьці сваё зьдзейсьненьне шляхам скліканьня на дэмакратычных асновах Устаноўчага Сойму.

Але і да скліканьня Устаноўчага Сойму ўся ўлада на Беларусі павінна належаць тым народам, якія на ёй жывуць.

Выканаўчы Камітэт Рады першага Усебеларускага Зьезду, папоўнены прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасьцяў, зьдзяйсьняючы мэты Зьезду, абвяшчае сябе часовай уладай на Беларусі для кіравання краем і скліканьня, як можна хутчэй, Усебеларускага Устаноўчага Сойму на аснове агульнага права для ўсякага дарослага, нялічучыся з нацыянальнасьцю, вызнаньнем і родам...

Дадзена ў Менску-Беларускім 21 (8) лютага 1918 г.

Выканкам стварыў урад — Народны Сакратарыят на чале з Я. Варонкам. Але 25 лютага 1918 года Менск занялі немцы. Яны забралі грашовую касу Народнага Сакратарыята, скінулі з яго будынка бел-чырвона-белы сцяг і разагналі службоўцаў. Акупанты папярэдзілі, што не дазволяць ніякай паважнай палітычнай дзейнасці. Нягледзячы на гэта, Выканкам Рады Усебеларускага з'езда працягваў сваю палітыку і зноў звярнуўся да жыхароў Беларусі з устаўной граматай, у якой акрэсліваліся дзяржаўны лад Беларусі, правы і свабоды яе грамадзянаў.

2-Я УСТАЎНАЯ ГРАМАТА ДА НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ

У часе сусьветнай вайны, што бурыць адны моцныя дзяржавы і аслабаняе другія, абудзілася Беларусь да дзяржаўнага жыцьця. Пасьля трох з паловаю вякоў нявол і зноў на ўвесь сьвет кажа беларускі народ аб тым, што ён жыве і будзе жыць. Вялікі Народны Збор — Усебеларускі Зьезд 5—17 сьнежня 1917 року, дбаючы аб долі Беларусі, зацьвердзіў на яе землях рэспубліканскі лад...

1. Беларусь у рубяжох расьсяленьня і лічэбнай перавагі беларускага народу абвяшчаецца Народнай Рэспублікай.

2. Асноўныя законы Беларускай Народнай Рэспублікі зацьвердзіць Устаноўчы Сойм Беларусі, скліканы на асновах агульнага, роўнага, простага, патаёмнага і прапарцыянальнага выбарчага права, не зважаючы на род, народнасьць і рэлігію.

3. Да часу, пакуль зьбярэцца Устаноўчы Сойм Беларусі, заканадаўчая ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Радзе Усебеларускага Зьезду, дапоўненай прадстаўнікамі нацыянальных меншасьцяў Беларусі.

4. Спаўняючая і адміністрацыйная ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Народнаму Сакратарыяту Беларусі, які назначаецца Радаю Зьезду і перад ёю трымае адказ.

5. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчаецца вольнасьць слова, друку, сходаў, забастовак, хаўрусаў: бязумоўная вольнасьць сумленьня, незачэпнасьць асобы і памешканьня.

6. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі ўсе народы маюць права на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію; абвяшчаецца роўнае права ўсіх моваў народаў Беларусі.

7. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі права прыватнае ўласнасьці на зямлю касуецца. Зямля перадаецца бяз выкупу тым, што самі на ёй працуюць. Лясы, вазёры і нутро зямлі абвяшчаюцца ўласнасьцю Беларускай Народнай Рэспублікі.

У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі ўстанаўляецца найбольшы 8-гадзінавы рабочы дзень...

Выдана ў Менску-Беларускім 9 сакавіка 1918 року.

У.А.

25 сакавіка 1918. Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі

Ідэя незалежнасці заваёўвала ўсё больш прыхільнікаў. Выканкам Рады Усебеларускага з'езда абвясціў яе Радаю Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). У яе склад былі ўведзеныя прадстаўнікі Віленскай Беларускай Рады, выдатныя дзеячы беларускага адраджэння браты Іван ды Антон Луцкевічы і Вацлаў Ластоўскі.

23 сакавіка А. Луцкевіч выступіў на паседжанні Народнага Сакратарыята. Ён гаварыў, што фармальна Беларусь застаецца тэрыторыяй Расеі, бо ні першая, ні другая ўстаўныя граматы не скасоўваюць абвешчанай на кангрэсе федэратыўнай сувязі з Расеяй. Тым часам падзеі паказалі, што спадзявацца на ўсходняга суседа нельга. Расея з Нямеччынай, не спытаўшыся ў беларусаў, падзялілі нашу зямлю паміж сабою ў выніку падпісанага бальшавікамі Берасцейскага міру.

А восьмай гадзіне вечара 24 сакавіка адкрылася паседжанне Рады БНР. Праца доўжылася ўсю ноч і завяршылася прыняццем наступнага дакумента.

3-Я УСТАЎНАЯ ГРАМАТА РАДЫ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

Год таму назад народы Беларусі разам з народамі Расеі ськінулі ярмо расейскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь; ня пытаючыся народу, ён кінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускія. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, ськідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расейскія цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай. Самі народы Беларусі ў васобе Устаноўчага Сойму пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязах Беларусі.

На моцы гэтага траціць сілу ўсе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасць чужому ўраду падпісаць і за Беларусь трактат у Берасьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелячы зямлю яго на часткі. На моцы гэтага ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі мае ўвайсьці ў зносіны з зацікаўленымі старанамі, прапануючы ім перагледзець тую часьціну Берасьцейскага трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць мірную ўмову з усімі ваяваўшымі дзяржавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбенную перавагу беларускі народ, а ласьне: Магілеўшчыну, беларускія часьці Меншчыны, Гродненшчыны (з Гродняй, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежных часьцяў суседніх губэрняў, заселеных беларусамі.

Беларуская Народная Рэспубліка зацьвярджае ўсе тыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаныя Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 року.

Абвяшчаючы аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што ўсе любячыя волю народы дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры зьдзейсьніць яго палітычна-дзяржаўныя ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі
Дана ў Менску-Беларускім 24 сакавіка 1918 року.

Акт 25 сакавіка быў рашучым пратэстам супроць падзелу Беларусі кайзераўцамі і бальшавікамі. Увесь этнічны беларускі абшар упершыню абвяшчаўся адзінаю дэмакратычнай дзяржавай. Народны Сакратарыят зацвердзіў дзяржаўную пячатку з выяваю «Пагоні». У Менску прадугледжвалася стварыць Беларускі універсітэт і Беларускую калегію для падрыхтоўкі кадраў новага дзяржаўнага апарату. Адкрыліся курсы беларусазнаўства для беларусаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Наладжваліся эканамічныя і гандлёвыя сувязі БНР з іншымі дзяржавамі. У Кіеве пачала дзейнічаць Беларуская гандлёвая палата і Беларуска-ўкраінскае таварыства збліжэння.

Незалежную Беларускую Народную Рэспубліку афіцыйна прызналі Арменія, Аўстрыя, Грузія, Латвія, Летува, Польшча, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Чэхаславакія і Эстонія.

Ніхто ўжо не мог заяўляць, што беларускага народа не існуе.

Як бы ім таго ні хацелася, ідэю нашай дзяржаўнасці не маглі ігнараваць і бальшавікі ў Расеі, якія мусілі даць беларускім камуністам дазвол на стварэнне БССР.

Дзень 25 сакавіка 1918 года стаўся пачаткам доўгага і пакутнага шляху да набыцця Беларусяй сапраўднай незалежнасці.

У.А.

Народны сакратарыят БНР. Злева направа: сядзяць — А. Бурбіс, Я.Серада, Я.Варонка, В.Захарка; стаяць — А.Смоліч, П. Крэчэўскі, К.Езавітаў, А. Аўсянік, Л.Заяц. Мінск. 1918.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Праваслаўны князь Лукашэнка і іншыя героі расійскай гісторыі

Самадзейны мастак з Пскова Ігар Быстроў мае шанц заняць пачэснае месца сярод праслаўленых мэтраў рускага мастацтва. Першую вядомасць жывапісцу прынеслі карціны, прысвечаныя сучаснай расійскай палітычнай эліце. Назвы гаварылі самі за сябе: «Чыноўнікі адпачываюць у лазні», «Любімец цара Барыска Нямцоў перасаджвае дваранскую конніцу на аленяў». Цяпер расійскі палітычны бамонд для яго тэматычна завузкі, і Быстроў пасунуўся на Захад. Адзін з апошніх твораў мастака — «Праваслаўны князь Лукашэнка адмаўляецца прыняць каталіцтва».

Нягледзячы на сціплыя мастацкія вартасці, творы кемлівага самавука атрымалі прызнанне — праўда, не столькі сярод эстэтаў, колькі ў журналісцкіх колах. А партыя Жырыноўскага, як паведамляе маскоўская «Общая газета», увогуле ў захапленні ад шэдэўраў маэстра Быстрова. Фракцыя ЛДПР нават плануе арганізаваць ягоную выставу непасрэдна ў памяшканні Дзяржаўнай Думы Расіі. «Жырыноўцы» разлічваюць такім чынам паўплываць на сваіх праціўнікаў, а сам мастак марыць аб вялікім прыбытку: героі ягоных твораў, лічыць І.Быстроў, хутка раскупяць свае з'едлівыя «партрэты» за любыя грошы, каб толькі схаваць іх з вачэй публікі.

Г.Ш.

І смех і грэх

Пачуццё гумару, як высвятляецца, нейкім чынам звязанае з жорсткасцю. У кожным разе, такую выснову можна зрабіць з вынікаў эксперымента, праведзенага нямецкім псіхолагам Вілібальдам Рухам.

Як паведамляе часопіс *Bild der Wissenschaft*, Рух даваў мужчынам паслухаць шэраг анекдотаў і рэгістраваў пры гэтым іхнюю рэакцыю. Потым кожны з «паддоследных» павінен быў вынесці вердыкт па спецыяльна прыдуманай крымінальнай справе. Высветлілася, што тыя ўдзельнікі эксперымента, якія смяяліся з анекдотаў мацней за іншых, выносілі больш суровыя прысуды «злачынцам».

Прычыны такой сувязі не вельмі зразумелыя, аднак Рух заўважыў некаторыя заканамернасці. Асабліва жорсткімі ў вынясенні прыгавораў былі мужчыны, якія моцна рагаталі з прымітыўных анекдотаў. Максімальнае пакаранне прызначалі асобы, якім больш за ўсё падабаліся анекдоты пра палітычных апанентаў (палітычныя погляды ўдзельнікаў эксперымента загадзя фіксаваліся). З гэтага даследчык зрабіў выснову, што яны нецярпімыя да ўсяго чужога, адметнага — а тут недалёка і да жорсткасці.

Акрамя таго, хоць гэта і не мае прамога дачынення да пачуцця гумару, псіхолаг Рух адзначыў, што вельмі жорсткімі ў вынясенні прысудаў былі мужчыны, якія гавораць шматслоўна, блытана і не могуць выкладаць свае думкі ў адпаведнасці з правіламі літаратурнай мовы.

Магдалена НЕПАКАЙ

Шесть миллионов крепостных

Шломо АВИНЕРИ

Передача Гонконга Китаю, произошедшая чуть более месяца тому, из события чисто политического превратилась в пышное празднование, знаменующее как возвращение единой Родине утраченных территорий, так и символический конец самой обширной империи в мире.

Нарочитая оплошность

Среди всех речей и фейерверков этой феерии, растранслированной телевидением, один аспект был совершенно упущен из виду, а именно — политическая воля шести миллионов граждан колонии Британской Короны, которые ныне переданы — без их согласия — из-под хотя имперского, но либерального колониального владычества под господство крупнейшего на сегодняшний день недемократического и репрессивного режима в мире. Эта нарочитая (и нарочито недемократическая) оплошность — один из самых тревожных прецедентов, созданных возвращением Гонконга под китайский контроль.

Отправной точкой для китайско-британских переговоров, приведших в 1984 году к соглашению о передаче Гонконга, явились установленные в XIX веке условия аренды, по которым Британия получала большую часть территории колонии Гонконг (основная часть земель этой территории находилась на материковом Китае). Предварительно Британия захватила — посредством одной только силы — имперский плацдарм на собственно острове Гонконг в ходе двух Опиумных войн. В соглашении, составленном Маргарет Тэтчер и Дэн Сяопином в начале 80-х, Британия приобретала гарантии дальнейшего существования свободной капиталистической экономики Гонконга даже под правлением Пекина («одна страна — две системы» — такова туманная формулировка, выдвинутая Дэн Сяопином). Но изъявление политической воли жителей самого Гонконга нигде не появлялось в балансе сил.

Мы никогда не узнаем ответа

Гонконгцев никогда не спрашивали, заинтересованы ли они в «возвращении» в Китай, откуда многие из них бежали за годы коммунистического правления. Быть может, они бы предпочли независимость или какой-нибудь международно гарантированный статус самоопределения? Или же они — упаси Господь! — предпочли бы даже сохранить некоторую связь с Британской Короной в качестве самоуправляемой зависимой территории?

Мы не знаем ответа на эти вопросы и никогда не узнаем, потому что гонконгцев никогда об этом не спрашивали. В эпоху, когда деколонизация продолжается и принцип самоопределения считается священным везде, от Боснии до Чечни и от Балтики до Палестины, это действительно неслыханно, чтобы шесть миллионов человек были переданы от одних хозяев другим как обычное движимое имущество. Русские аристократы частенько продавали целые деревни и поместья, включая крепостных, как будто последние являлись неодушевленными предметами. Подобные сделки осуществлялись раньше и на международном уровне (вспомните о разделах Речи Посполитой или о Ялтинских соглашениях 1945 года). Но в эпоху деколонизации, честное слово, это аномалия.

Беспринципная Железная Леди

Более того, горькая ирония данной аномалии заключается в том, что британский премьер-министр Тэтчер, которая передала Пекину шесть миллионов «душ» (используем старый русский термин для обозначения подобных рабов), была той самой Железной Леди, которая двумя годами ранее, в 1982, решительно отправилась на войну за освобождение двенадцати тысяч поселенцев на Фолклендских островах, куда могли прийти генералы из Буэнос-Айреса. Шесть миллионов жителей Гонконга имеют право на самоопределение, но об этом никто не подумал. Все потому, что фолклендцы были белыми и англичанами, в то время как гонконгцы «просто» китайцы?

Легко понять общие интересы Великобритании и Китая: Пекином владеет абсолютный территориальный императив — восстановить то, что считается единым и неделимым Китаем. Великобритания озабочена вопросами торговли и коммерции в Китае — точно так же, как это было во время Опиумных войн. Тогда инструментом, гарантирующим Британии свободу торговли на китайском рынке, являлась канонерская лодка; сегодня это полное неуважение фундаментальных прав шести миллионов человек. В то время как государственные интересы Китая и коммерческие выгоды Великобритании ясны, менее понятно, почему нигде в мире общественное мнение не поставило вопрос о самоопределении населения Гонконга.

Еще придется пожалеть

В этом — коренной порок договора о передаче Гонконга. Он создает прецедент, о котором многие впоследствии могут пожалеть. Совершенно очевидно, что британское господство должно было исчезнуть. Также очевидно, что Китай имел законные территориальные претензии. Но полное неуважение к мнению жителей Гонконга бросает тень на весь процесс. Китайское триумфаторство и британская имперская ностальгия, странная чопорная смесь которых характеризовала это полуночное карнавальное шествие, были весьма неуместны.

© Project Syndicate, 1997

Шломо Авинери — профессор политологии Еврейского Университета в Иерусалиме и бывший министр иностранных дел Израиля.

Стеллажи и стойки
– ТОРГОВЫЕ –
– ЭКСПОЗИЦИОННЫЕ –
– ОФИСНЫЕ –
ДЛЯ ГАЗЕТ И ЖУРНАЛОВ,
– ДЛЯ ПАПОК И БУМАГ
ПРОДАЖА ГОТОВЫХ ИЗДЕЛИЙ И ИЗГОТОВЛЕНИЕ ПО ИНДИВИДУАЛЬНЫМ ЗАКАЗАМ

Тел. (017) 210-02-53
факс 236-24-41

Тайвань – не Ганконг

Літаральна праз некалькі гадзінаў пасля перадачы Ганконга Кітаю лідэр КНР Цзян Цзымінь заявіў, што гэта паслужыць прыкладам для вырашэння пытання з Тайванем. «Але Тайвань — не Ганконг», — рашуча заявіў у адказ прэзідэнт Тайваня.

Кітайскія палітыкі даўно звярнулі свае позіркі на «залатую курыцу» — Тайвань, дзе месцяцца трэція па велічыні ў свеце рэзервы замежнай валюты. Сапраўды, чаму б не далучыць тэрыторыю з 21,5 мільёнамі жыхароў, востраў на марскім шляху, па якім праходзіць 1/4 сусветнага марскога гандлю? У дадатак, агульны аб'ём экспарту-імпарту тут склаў летась 217 мільярдаў долараў ЗША.

Але насельніцтва Тайваня без захаплення глядзіць на перспектыву «ўз'яднання». Аддзяліліся яны яшчэ ў 1949 годзе, калі Чан Кайшы пасля перамогі камуністычнага рэжыму ў Кітаі заснаваў на выспе сваю рэспубліку. Тайванцы скептычна ставяцца да «інтэграцыі» не столькі з-за камуністычнай ідэалогіі ў Кітаі, колькі з-за вялікай розніцы ўзроўню жыцця: на капіталістычным Тайвані даход на душу насельніцтва складае каля 13.500 долараў у год, у той час як «будаўнікі кітайскага камунізму» маюць 2.900 — амаль у 5 разоў меней. Менавіта таму жыхары вострава прагаласавалі на леташніх прэзідэнцкіх выбарах за дэмакрата Лі, які паслядоўна дамагаецца прызнання суверэнітэта Тайваня міжнароднай супольнасцю, а таксама ўступлення ў ААН і *WTO* (Сусветную гандлёвую арганізацыю).

У процівагу ляманту з мацерыка аб тым, што ўсе кітайцы павінны жыць у адной краіне, як сведчыць апытанне, праведзенае ў пачатку ліпеня, больш за палову жыхароў Тайваня назвалі сябе тайванцамі — і толькі трэцяя частка ідэнтыфікавала сябе як кітайцаў.

Тайвань разумее, што справіцца з мільярдным Кітаем адзін не здолее. Таму гарантыяў сваёй бяспекі ён шукае ў Еўропе, ЗША і Японіі. Тыя ж, аднак, ніяк не вызначаць паслядоўную палітыку ў дачыненні да выспы. Напрыклад, Злучаныя Штыта то пасылаюць два вялікія авіяносцы ў падтрымку Тайваня, калі падчас прэзідэнцкіх выбараў Кітай вырашыў недалёка ад выспы правесці ваенныя вучэнні, то прызнаюць, як, дарэчы, іншыя заходнія краіны, абгрунтаванасць патрабаванняў Пекіна наконт Тайваня.

Магчыма, у будучым пазіцыя заходніх краінаў у пытанні падтрымліваць ці не падтрымліваць Тайвань у барацьбе за незалежнасць будзе залежаць ад таго, што Кітай зробіць з Ганконгам.

Дзмітры ДАРОХІН

На здымках: спадар Лі — прэзідэнт Тайваня; сіла дэмакратыі: інваліды старанна чакаюць у чарзе, каб прагаласаваць на першых прамых прэзідэнцкіх выбарах.

Дарэчы

Некалькі датаў з гісторыі Тайваня

1949 — Пасля паразы ад камуністычных сілаў прэзідэнт Чан Кайшы размяшчае свой урад на Тайвані. Разам з ім перасоўваюцца з мацерыка 1,5 мільёна чалавек. Чан Кайшы ўсталёўвае ваеннае становішча з мэтай атрымання абсалютнай улады.

1972 — Першыя парламенцкія выбары. У Нацыянальную Асамблею выбрана 53 дадатковыя дэлегаты. Тым не менш, «пажыццёвыя» парламентарыі з мацерыка захоўваюць большасць.

1978 — Сын Чан Кайшы, Чан Чынгкуа абіраецца прэзідэнтам і прызначае карэнных тайванцаў на высокія пасты.

1986 — Лідэры тайваньскай апазіцыі арганізоўваюць Дэмакратычную прагрэсіўную партыю (ДПП) — гэта рэакцыя на забарону дзейнасці палітычных партыяў.

1987 — Прэзідэнт Чан Чынгкуа адмяняе 38-гадовае ваеннае становішча і ўзаконьвае дзейнасць палітычных партыяў.

1988 — Чан Чынгкуа памірае. Былы віцэ-прэзідэнт Лі становіцца першым прэзідэнтам-тайванцам.

1991 — Адбываюцца першыя шматпартыйныя выбары ў Нацыянальную Асамблею. «Пажыццёвыя» дэлегаты вымушаныя пакінуць свае месцы.

1996 — Лі ў выніку першых прамых дэмакратычных выбараў становіцца прэзідэнтам Тайваня.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Вербная электрычнасць

У амерыканскім штаце Нью-Йорк ёсць спецыяльная ферма, дзе вырошчваюць гібрыдную вярбу, якая служыць палівам для электрастанцыі.

Гэты гатунак вярбы выведзены якраз для таго, каб пасля драўніну спальваць у катлах электрагенератараў. Гэта шчыльны куст з гнуткімі галінамі, якія вырастаюць за год на тры з паловай метры. Хоць кусты садзяць з прамежкамі, прайсці ў такі «лес» немагчыма: галіны сплятаюцца суцэльнай сцяной. За год вярба дае ў 10 разоў больш драўніны, чым звычайны прыродны лес.

Для спальвання галіны абсякаюць кожныя тры гады і зрабняюць на кавалкі ў 5 см. Хоць такое паліва і не таннейшае за вугаль, затое дым ад дроў менш таксічны. Акрамя таго, калі спальванне нафты і вугалю выпускае ў атмасферу вуглякіслы газ, які ў свой час быў узяты з паветра і «пахаваны» ў тоўшчах горных парод, то спальванне дроваў вызваляе толькі тую вуглекіслату, якую вербы забралі з атамасферы за тры мінулыя гады — і зноў паглынуць да новага ураджая. Такім чынам, вербная электрычнасць не ўзмацняе парніковы эфект на нашай планеце.

Без пілота, але з прэтэнзіяй на рэкорд

У Цэнтры лётных даследаванняў Нацыянальнага касмічнага агенцтва Злучаных Штатаў (*NASA*) праходзіць выпрабаванні новы самалёт на сонечных батарэях.

Гэты самалёт, якому далі імя *Pathfinder Plus*, — адна з мадэляў, што з'явіліся ў працэсе рэалізацыі праграмы *Erast*. Мэта гэтай праграмы *NASA* — распрацаваць беспілотны самалёт, які мог бы самастойна, пры дапамозе дыстанцыйнага кіравання, праводзіць даследаванні высокіх слаёў атмасферы. Паводле тэхнічных умоваў, выстаўленых *NASA*, сонечныя батарэі і акумулятары новай машыны мусяць быць настолькі дасканалыя, каб забяспечыць некалькі дзён, а то і тыдняў беспярапыннага палёту. Акрамя таго, бартавы камп'ютэр павінен весці самалёт строга ў адпаведнасці з зададзеным маршрутам.

Pathfinder Plus, здаецца, адпавядае гэтым умовам. На папярэдніх выпрабаваннях ён на працягу дзесяці дзён без пасадкі лётаў над поўднем Злучаных Штатаў і ні разу не збіўся са шляху. Канструктары спадзяюцца, што неўзабаве іхняе крылатае дзіця паб'е і рэкорд вышыні для беспілотных самалётаў, які на сённяшні дзень складае 15.392 м над зямлёй.

Калі выпрабаванні пройдуць паспяхова да канца, то на базе версіі Pathfinder Plus будзе распрацоўвацца большая мадэль, якая зможа ўзяць на борт дадатковую колькасць навуковай апаратуры. Новы самалёт уздымаецца ў паветра і ляціць пры дапамозе шасці аўтаномных прапелерных рухавікоў.

Чаму мангусты не баяцца змеяў

Многія памятаюць яшчэ з дзіцячых кніжак Кіплінга, што мангусты — жвавыя звяркі, якія жывуць у Паўднёва-Усходняй Азіі, — не баяцца змяіных укусаў. Чаму ж?

Гэтае пытанне даследавала група ізраільскіх біёлагаў з інстытута Вейцмана. Высветлілася, што атрутныя рэчывы яду кобры (акулярнай змяі) далучаюцца да клетак мускулаў у тых месцах, якія прыродай прадугледжаныя для ацэтылхаліну — рэчыва, з дапамогай якога перадаюцца сігналы ад нервовай сістэмы мышцам. Займаючы месца ацэтылхаліну, яд блакіруе перадачу сігналаў, у выніку наступае паралюш перш за ўсё дыхальнай мускулатуры — і ахвяра гіне. А ў мангусты ацэтылзалінавыя рэцэптары маюць крыху іншую будову. І хоць адрозненне ўсяго ў чатыры амінакіслаты з некалькіх соцень, гэтага дастаткова, каб атрута не дзейнічала.

Дарэчы, у змеяў ацэтылхалінавыя рэцэптары таксама адметныя — таму яны і не гінуць ад уласнага яду.

На здымку: мангуста нападае на змяю.

Эфект лотаса

Нямецкі прафесар Вільгем Барлат стварыў новую пластмасу, якая паўтарае ўласцівасці лістоў лотаса — усходняй кветкі, апаэтызаванай многімі народамі.

Барлат дэманструе сваё вынаходніцтва: ён падстаўляе пад выхлапную трубу дызельнага рухавіка дзве пласцінкі — звычайную керамічную і з новай пластмасы. Хутка абедзве пласцінкі чорныя ад сажы. Але калі кераміку адмыць ад сажы можна толькі з дапамогай спецыяльных сродкаў, з пластмасы сажа сыходзіць ад некалькіх кропель вады.

Ідэю прафесару падалі лісты лотаса, да якіх не прыстае ніякі бруд (нездарма ж на Усходзе гэтая расліна — сімвал чысціні). Цяпер некаторыя галандскія і нямецкія фірмы думаюць над тэхналогіяй пакрыцця тонкім слоем Барлатавай пластмасы фасадаў дамоў і кузаваў аўтамабіляў.

Па матырялах замежнай прэсы падрыхтавала
Магдалена НЕПАКАЙ

Отдых и путешествия

СТРАНА	МАРШРУТ	К-ВО ДНЕЙ	ПРОГРАММА	ТРАНС-ПОРТ	СРОКИ	ПРОЖИВАНИЕ	ПИТАНИЕ	УСЛУГИ	СТОИМОСТЬ	ТЕЛЕФОН	ЛИЦЕНЗИЯ	ФИРМА
БОЛГАРИЯ	Солн. Берег, Созопол, Кранево, Зол. Пески	12-13	Отдых	Авиа / Автобус	август, сентябрь	отель **, коттеджи	завтрак	Медстраховка, Курортный сбор, проезд.	от $ 305 / от $ 160	(017) 255-18-68, 253-37-39	МСТ № 281, 1.10.96-1.10.98	ЭКОЛОГИЯ-ТУР
	Солнечный Берег, Несебр, Св. Влас	12	Отдых	Авиа, автобус, лич.авто	август, сентябрь	отель **, ***, апартаменты, коттеджи	без питания или завтрак	Трансфер, страховка. Информационный коктейль.	от $ 185	(017) 274-68-04, 264-10-87	МСТ № 281, 22.11.96-22.11.98	КЭТЭЛИНА
	Балчик	14	Отдых	Авто	14,27.08, 9.09	гостиница**	без питания	Медстраховка, гид, ком. сбор.	авг.–185 сен.–160	(017) 233-39-75, 245-38-73	МСТ № 190, 4.10.96-4.10.98	ТУРФИРМА Н.КУДРЕВИЧ
Литва (инд. и группы); Латвия, Польша, Чехия, Россия, Болгария, Турция, Финляндия; Крым; Паланга, Друскининкай, Юрмала. Евровизы.										(017) 223-54-25	МСТ № 127/1, 4.10.96-23.09.98	САУНДЖЕ-ТУР
СЛОВАКИЯ	Курорт «Бардеевские купели»	12	Отдых	Автобус	август, сентябрь	отель ** с удобствами	завтрак, ужин	Медстраховка, минеральные источники.	$ 260-270	(017) 255-18-68, 253-37-39	МСТ № 281, 1.10.96-1.10.98	ЭКОЛОГИЯ-ТУР
ЛИТВА	Друскининкай	любое	Отдых, лечение	по заказу	август, сентябрь	санатории, пансионаты, част.дома	3-разовое	Проживание, курсовки без з/п.	по справке			
УКРАИНА	Курорт «Коблево»	13	Отдых	А	август	3-местные номера	3-разовое	Детям до 14 лет – значительные скидки.	от $ 170	(017) 227-61-97, 227-31-35	МСТ № 163, 26.09.96-26.09.98	ДРОМ-ТУР
Отдых: Болгария (автобус, самолет), Чехия, Венгрия; Прибалтика; Одесса. Экскурсионные туры: Париж – Амстердам, Чехия. Шоп: Варшава, Вильнюс, Москва.										(017) 213-30-49, 233-15-44	МСТ № 133, 23.09.96-23.09.98	ОЛИАНА
ОТДЫХ В БОЛГАРИИ – 190 у.е. – 12.08. ОТДЫХ В КРЫМУ – полный пансион – $ 12/сутки. СРОЧНАЯ И НЕСРОЧНАЯ ПОДДЕРЖКА В ЛИТВУ.										(017) 264-73-32	МСТ № 304, 15.01.96-15.01.98	ЛАЭРТИТА
БОЛГАРИЯ	Золотые Пески	12	Отдых	Автобус	август, сентябрь	отель **, ***	по справке	Страховка, трансфер.	от 260 у.е.	Туристско-коммерческое общество "ВЕСТТУР" ВЕСТ ТУР WEST TOUR Тел. (017) 230-31-83, 230-32-91, 235-25-11, 235-25-52 Лиц. МСТ №13,18.08.96-18.08.98		
ИСПАНИЯ	Коста-Брава	8, 10	Отдых, экскурсии	Авиа, автобус	август-октябрь	отель **-****	завтрак+ ужин	Страховка, виза. Гид, экскурсии – по желанию.	от 500 у.е.			
Транспортные услуги автобусами «Сетра», «Скания» по маршруту Берлин-Ганновер-Эссен-Оснобрюк-Роттердам-Амстердам. Визовая поддержка (14 дней, 1, 1,5, 3 месяца).												
БОЛГАРИЯ	Солнечный Берег, Созопол, Несебр, Китен	12	Отдых	Авиа «Минск-2»	август, сентябрь	апартаменты, отель **, ***	завтраки	Трансфер, страховка.	от $ 370	«ДЖЭТТРЭВЕЛ» г. Минск, ул.Маяковского, 14 Тел. 227-67-13 221-05-11 221-59-27 Лиц. МСТ №438, 24.03.97-24.03.99		
ГРЕЦИЯ	Халкидики, Кассандра, о. Тасос	11-13				апартаменты, отель **-*****	полупансион	Гид, трансфер, страховка, виза.	от $ 590			
ИСПАНИЯ	Коста-Брава, Салоу	10				отель **-****	завтрак или завтрак+ужин	Гид, трансфер, страховка, виза.	от $ 600			
Внимание! Attention! Achtung! Окажем помощь в получении виз для посещения стран Шенгенского соглашения. Недорого.												
МАЛЬТА	По заказу	от 7	Отдых, изуч. англ. языка	Авиа из Москвы	круглый год	отель ***-*****	п/пансион (швед. стол)	Медстраховка	$ 500	(017) 226-50-42, 210-55-36	МСТ № 067, 30.08.96-30.08.98	LATIN-SERVISS
СТРАНЫ БАЛТИИ	Вся Прибалтика по заказу	3-20	Отдых, лечение, экскурсии, бизнес-туры	Автобус, ж/д, авиа	круглый год	отель **-*****	по желанию	Медстраховка, помощь в приобретении авто	от $ 70			
ТУНИС	Хаммамет, Сусс, Монастир	8-15	Отдых, экскурсии	Авиа из Варшавы	август-октябрь	отель ***-*****	п/пансион (швед. стол)	Медстраховка	от $ 460			
ИТАЛИЯ	г.Сан-Ремо, г.Апассио	12	Отдых+Экск.	Авиа, продажа билетов	с 2,13, 24.08	отель ***-****	п/пансион (швед.стол)	Страховка, трансфер, гид. Экскурсии: Монако, Ницца, Монте-Карло.	от 900 у.е.	"Актам" Тел. (017) 227-81-65, 226-04-86 Лиц. МСТ №113,13.09.96-13.09.98		
БОЛГАРИЯ	Бургас, Созопол, Приморское, Дюны	12	Отдых	Авиа, автобус	август, сентябрь	отель **-****, част. апартаменты	по желанию	Страховка, трансфер.	от 310 у.е.			
Индивидуальные туры в Литву. Евровизы, ваучеры.												
СЛОВАКИЯ	Детский отдых: Низкие Татры – 15 дней.			Автобус	август, сентябрь	Детский дом отдыха	4-разовое питание+ витамины	Страховка, гид, экскурсионная программа.	от 220 у.е.			
БОЛГАРИЯ	Несебр	12	Отдых	Автобус, авиа	постоянно	част. отели	завтрак	Медстраховка, курортная такса.	от 250 у.е.	Тел. (017) 223-59-80, 223-09-15 Лиц. МСТ №305,15.11.96-15.11.98		
ЛИТВА	Оформление выездных документов (в том числе многократ.). Поездки в Клайпеду за автомобилями.											
ГОЛЛАНДИЯ-БЕЛЬГИЯ-ФРАНЦИЯ-ЛЮКСЕМБУРГ		10	Экскурсия	Автобус класса «Мерседес»	с 20. 08. и круглый год	отели***	завтрак	Страховка, виза, гид.	390 у.е.+ виза			

ПО ВОПРОСАМ РАЗМЕЩЕНИЯ ИНФОРМАЦИИ В ТАБЛИЦЕ ОБРАЩАЙТЕСЬ В ОТДЕЛ РЕКЛАМЫ ПО ТЕЛ. (017) 236-24-41, 210-02-54.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

«Зоркі «Што, дзе, калі?» на Брагінскай зямлі»

Шоў пад такой назвай будзе праведзенае ў Брагіне з нагоды 850-годдзя горада.

Ідэя мерапрыемства належыць гомельскаму «знатаку» Леаніду Клімовічу і падтрымана райвыканкамам. Ідэя сапраўды нядрэнная, калі ўлічыць, што Масква і Брагін — аднагодкі, з 1147 года, і можа атрымацца сапраўды цікавая шоў-гульня. Толькі б не пабіліся маскоўскія госці з мясцовай шляхтай, хто і на колькі дзён старэйшы.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

400 год як ва ўсіх

Юбілеі бываюць не толькі ў гарадоў, але і ў вёсак. 400-годдзе ўзнікнення святкавала вёска Дашкаўка Магілёўскага раёна.

Упершыню паселішча ўзгадваецца ў 1597 годзе як заснаванае старастам Крычаўскім і Слуцкім, князем Саламярэцкім. За прайшоўшы з той пары час Дашкаўка пражыла ўсё, што зведала, бадай, любая беларуская вёска. Паўночную вайну ды знаёмства з маскоўскімі і шведскімі войскамі ў пачатку XVIII ст.; тут быў перавязачны пункт рускай арміі падчас вайны з французамі 1812 года; акупацыя ў гады 2 сусветнай вайны.

Сёння Дашкаўка — тыповая вялікая вёска. У ёй жыве каля 1.900 чалавек, большасць якіх працуе ў калгасе «Красная звезда». Ёсць сельская бальніца, крама, клуб. Усё як ва ўсіх. І так ужо без веку паўтысячагоддзя.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Фотавыстава ў Магілёве

У Магілёве пачала працу выстава фотамайстроў Ізраіля.

Калекцыя лепшых мастакоў гэтай бліжнеўсходняй краіны, сярод якіх шмат былых нашых землякоў, ужо экспанавалася ў Барысаве, плануецца яе выставіць у Мінску, Гродне і Лідзе. Калекцыя была прадастаўлена Таварыствам фотамастацтва Ізраіля, аўтары выставы маюць кваліфікацыю міжнародных і нацыянальных фотамайстраў.

Выстава наладжаная Магілёўскай асацыяцыяй «Кола сяброў» і фотастудыяй *3 plus*. Калекцыя выклікала вялікую цікавасць гледачоў. Яна нагадвае, колькі агульнага ёсць у народаў нашых краін, як шчыльна гісторыя звязала іх лёс.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Светлагорскі дэсант

Адбыўся першы выпуск спартсменаў-парашутыстаў Светлагорскага аэраклуба.

50 хлопцаў і дзяўчат ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў прайшлі поўны курс падрыхтоўкі і зрабілі па 2 сапраўдныя скачкі з парашутам. Цяпер рыхтуецца да заняткаў новая партыя курсантаў. Дарэчы, раней гэты клуб быў самалётна-верталётным, але з-за эканамічных праблем ён мусіў стаць парашутным. Напэўна, быць парашутыстам крыху менш рамантычна, чым пілотам, але значна лепш, чым папоўніць шэрагі светлагорскіх наркаманаў.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Ленін каля гімназіі просіць рамонту

«Паранены» Ленін стаіць ужо некалькі тыдняў каля элітнай магілёўскай гімназіі №3.

Невядомыя адбілі правадыру сусветнага камуністычнага руху палову гіпсавай сківіцы, і цяпер помнік соцрэалізму чакае вырашэння свайго лёсу. Але што рабіць са «свяшчэннай» постаццю, ніхто не ведае — каб знесці скульптуру, патрабуецца вельмі высокі дазвол. У любым выпадку рашэнне камусьці давядзецца прымаць, бо ўжо недалёка 1 верасня, калі дзеці штодзень будуць бачыць панішчаны помнік бальшавіцкаму лідэру.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

КАДРЫ

Ну, і хто там?

Беларуская мода ў Нямеччыне

Беларускія мадэльеры бяруць удзел у Міжнароднай выставе высокай моды, якая 3 жніўня адчынілася ў Дзюсельдорфе (ФРГ).

На выставе будуць прадстаўленыя дызайнерскія распрацоўкі жаночага і дзіцячага адзення, жаночая бялізна і купальныя касцюмы з 80 краін свету. Беларускую моду будуць рэпрэзентаваць калекцыі галоўнага мастацкага кіраўніка Рэспубліканскага цэнтра моды Ніны Астапенкі і дызайнера вытворча-гандлёвай фірмы «8 сакавіка» Святланы Рыбалкінай. Побач з дэманстрацыяй на стэндах, распрацоўкі беларускіх мадэльераў возьмуць удзел у шоў-праграме. У Дзюсельдорф павезлі сваю прадукцыю таксама фабрыкі «Элема» і «Мілавіца».

БелаПАН

Жанчыну выціснулі рэчы

Жыхарка Бабруйска Аляксандра Унукоўская ўжо больш за два тыдні не можа трапіць ва ўласную кватэру.

Перашкаджаюць ёй гэта зрабіць яе ж уласныя рэчы. 74-гадовая пенсіянерка Унукоўская ніколі не выкідвала таго, што з'яўляліся ў кватэры. Засталіся ўсе рэчы памёрлага мужа, кватарантаў, што доўгі час жылі ў яе. За дзесяцігоддзі ўсяго назапасілася столькі, што месца для самой гаспадыні не засталося, і два тыдні пенсіянерка жыла ў пад'ездзе, на лесвіцы.

Унукоўская — абсалютна псіхічна здаровая жанчына, што засведчылі ўрачы. І калі раней многае яна не выкідвала, бо было шкада, то цяпер проста няма сіл. Запрасіць каго-небудзь дапамагчы пенсіянерка не хоча, бо баіцца крадзяжу. Усё, чым здолелі дапамагчы міліцыянты, — гэта ўціснулі апошнія рэчы Унукоўскай у кватэру і зачынілі дзверы. Літасцівыя суседзі ўзялі старую жыць да сябе.

Іван ЗАСАДА

Даты і лёсы

5 жніўня

1506. 7-тысячнае беларускае войска пад камандаваннем Міхаіла Глінскага разбіла пад Клецкам войска крымскіх татараў. Пасля гэтай бітвы буйныя напады татараў на Беларусь фактычна спыніліся.

1850. Нарадзіўся Гі дэ Мапасан, вядомасць якому прынеслі «пікантныя» навелы пра жыццё Францыі дзевятнаццатага стагоддзя.

1895. У Лондане памёр буйны фабрыкант і правадыр пралетарыяту Фрыдрых Энгельс.

1914. У Клііўлендзе, штат Агаё, на вуліцах з'явіліся першыя ў свеце электрычныя светлафоры.

1962. Нельсан Мандэла, цяперашні прэзідэнт ПАР, быў прыгавораны да пажыццёвага зняволення за спробу звергнуць расісцкі ўрад Паўднёва-Афрыканскай рэспублікі.

1962. Памерла легендарная амерыканская кінаактрыса, секс-сімвал 50-х Мэрылін Манро. Як ні дзіўна, пры жыцці яе не адзначылі ніводным кінематаграфічным прызам. Мяркуюць, што 36-гадовая актрыса памерла ад перадазіроўкі снатворнага. Яе знайшлі зусім голай, побач ляжалі шпрыц і тэлефонная слухаўка. Нехта скраў яе дзённік. Існуе версія, што Манро забілі агенты ЦРУ, бо яна нібыта хацела перадаць Фідэлю Кастру і Мікіту Хрушчову нейкую сакрэтную інфармацыю, пачутую ад сваіх каханкаў Роберта і Джона Кенэдзі.

1970. Упершыню ў прафесійным футболе для вызначэння пераможцы была скарыстаная серыя пасляматчавых пенальці: «Манчэстэр Юнайтэд» перамог «Гал Сіці» з лікам 4:3.

6 жніўня

1517. У Празе пабачыла свет першая беларуская (і першая ўсходнеславянская) друкаваная кніга. За тры гады Францішак Скарына выдаў там 23 кнігі Бібліі ў сваім перакладзе на старабеларускую і з уласнымі гравюрамі.

1637. Памёр англійскі драматург, паэт і акцёр Бен Джонсан, у адной з п'ес якога іграў сам Шэкспір. Як і многіх вядомых літаратараў, яго пахавалі ў Вестмінстэрскім абацтве, дзе існуе Куток паэтаў. Але Джонсан не заплаціў за месца для магілы, і таму магільшчыкі неўзабаве адкрылі яе і паставілі труну вертыкальна, каб вызваліць месца для больш «плацежаздольнага» нябожчыка. Так Бен і стаіць, падпіраючы кут, і нагадвае наведнікам, што лепш наперад рыхтаваць сабе месца на могілках.

1881. Нарадзіўся шатландскі бактэрыёлаг, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Аляксандр Флемінг, які адкрыў пеніцылін, калі даследаваў зялёную цвіль, якой пакрылася нейкая страва ў забытай талерцы.

1890. Забойца Ўільям Кемлер стаўся першым чалавекам, якога пакаралі смерцю на электрычным крэсле (адбылося гэта ў турме «Обёрн», штат Нью-Йорк). Смерць на «гуманнай» прыладзе прыйшла да Кемлера толькі праз 8 хвілін.

1926. Амерыканка Гертруда Ідэрлі першай з жанчын пераплыла Ла-Манш, на што ёй спатрэбілася 14 гадзін 34 хвіліны.

1945. Амерыканскі бамбардзіроўшчык *B-29* «Інола» скінуў першую атамную бомбу на Хірасіму.

1977. З канвеера мінскага ВА «Гарызонт» сышоў першы каляровы тэлевізар «Гарызонт 723».

1994. У Вільні пачаўся з'езд беларусаў Балтыі, на якім абмяркоўваліся становішча ў Беларусі і спосабы адраджэння беларускай культуры і мовы ў балтыйскіх краінах.

7 жніўня

1556. У небе над Базелем у Швейцарыі з'явіўся адзін з першых зарэгістраваных НЛА.

1876. Нарадзілася знакамітая шпіёнка Мата Хары (Маргарэта Гертруда Цэле), якая перадавала французскія ваенныя сакрэты немцам падчас першай сусветнай вайны. Пасля разводу з мужам яна пачала выступаць у Парыжы з эратычнымі ўсходнімі танцамі і набыла мноства каханкаў сярод афіцэраў Генеральнага штаба. Толькі ў 1917 г. французы «вылічылі» яе, арыштавалі і расстралялі.

1900. Ёган Хурлінгер з Аўстрыі паставіў рэкорд у хадзьбе на руках. За 55 дзён ён прайшоў дагары нагамі 1.400 км з Вены ў Парыж з сярэдняй хуткасцю 2,54 км у гадзіну.

1910. Нарадзіўся Генадзь Цітовіч — музыказнаўца і этнограф, заснавальнік Дзяржаўнага народнага хору Беларусі.

1915. Спынілася выданне «першае беларускае газэты з рысункамі» «Наша Ніва». Пажадаем доўгага жыцця яе нашчадку — сучаснай «Нашай Ніве».

1992. Пётр Кожын з Санкт-Пецярбурга здзейсніў рэкордны марафонскі забег на Эльбрус. За 6 гадзін 31 хвіліну спартсмен прабег 43 км, прычым узняўся на 4.001 м увышыню.

СПОРТ

Медалі з Грэцыі

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА: БРОНЗА СА СТАРАЖЫТНЫХ АФІНАЎ

Каля 2.000 лёгкаатлетаў з 200 краін свету прымаюць удзел у VI чэмпіянаце свету, які адкрыўся ў мінулую пятніцу ў сталіцы Грэцыі Афінах.

Першы дзень чэмпіянату прынёс і першы медаль беларускай камандзе. У спартыўнай хадзьбе на 20 км мінчанін Міхаіл Хмяльніцкі прыйшоў да фінішу трэцім, апярэдзіўшы 46 канкурэнтаў, а прайграў толькі двайм — мексіканцу Даніэлю Гарсія і расіяніну Міхаілу Шчэннікаву. Шостае месца ў вопытнага Яўгена Місюлі, які папярэдне быў лідэрам нашых хадакоў.

Спаборніцтвы ў хадзьбе развіваліся драматычна. Да 15-га кіламетра наперадзе ўпэўнена ішоў срэбраны прызёр Алімпіяды ў Атланце Ілля Маркаў (Расія). Ён не знізіў інтэнсіўнасць руху і пасля таго, як атрымаў два папярэджанні ад судзей за парушэнне стылю хадзьбы (калі рух хадака можна кваліфікаваць як бег). Трэцяе папярэджанне аказалася ракавым — лідэру паказалі чырвоную картку і знялі з дыстанцыі. Хмяльніцкі за 4 км да фінішу яшчэ ішоў другім, але ўтрымаць гэтую пазіцыю не змог. І ўсё ж бронзавы медаль чэмпіянату свету — лепшае дасягненне.

У штурханні ядра ў мужчын панавалі атлеты Украіны і ЗША. Далей за ўсіх штурхнуў 7-кілаграмовы снарад кіяўлянін Аляксандр Багач — на 21 м 47 см. Толькі 3 сантыметры саступіў яму пераможца папярэдняга сусветнага чэмпіянату Джон Годзіна (ЗША). Трэцім падняўся на п'едэстал Алівер-Свэн Будэр (Германія) — 21 м 24 см. На жаль, беларусы Віктар Булат і Дзмітрый Ганчарук не змаглі пераадолець кваліфікацыйны бар'ер.

За шмат год беларускія кідальнікі молата прывучылі аматараў спорту да медалёў. Аднак на гэты раз знакаміты Ігар Астапковіч абмежаваўся пятым месцам — 79 м 70 см. А трыо лепшых склалі немец Хайнц Вайс — 81 м 78 см, украінец Андрэй Скварук — 81 м 46 см і Васіль Сідарэнка з Расіі — 80 м 76 см.

На мяжы сусветнага рэкорду балансавалі спрынтэры. Усяго 2 сотых секунды не хапіла амерыканцу Морысу Грыну для таго, каб паўтарыць дасягненне алімпійскага чэмпіёна з Канады Донавана Бэйлі. У фінале ён праімчаўся 100 метраў за 9,86, Бэйлі — за 9,91, яшчэ адзін амерыканец Цім Мантгомэры — за 9,94.

У жанчын чэмпіёнкай стала Марыон Джонс (ЗША), якая нядаўна кінула заняткі баскетболам, — 10,83, крышачку ёй саступіла на фінішы Жанна Пінтусевіч (Украіна) — 10,85.

Пасля першага дня спаборніцтваў у сямібор'і беларуска Наталля Сазановіч адставала на 70 ачкоў ад немкі Сабінэ Браўн. Прабіліся ў асноўныя спаборніцтвы наш скакун у даўжыню Аляксандр Главацкі і скакуння трайным Жанна Гурэева.

ВОДНЫЯ ЛЫЖЫ: ТАМСАМА Ў ГРЭЦЫІ

Поспеху дасягнулі на чэмпіянаце Еўропы ў Грэцыі беларускія водналыжніцы: у другі раз стала абсалютнай пераможцай Вольга Паўлава; Марыне Басінскай (Амельянчык) уручана срэбная ўзнагарода за выступленне ў фігурным катанні.

СУЧАСНАЕ ПЯЦІБОР'Е: ДЗЕ ЗНОЙДЗЕШ, ДЗЕ ЗГУБІШ

Гамельчанка Жанна Шубянок у мінулыя гады тройчы заваёўвала тытул мацнейшай пяціборкі свету. Але ў гэтым чэмпіянаце ёй пашанцавала менш — 4-е месца. Затое прыемна здзівілі мужчыны: Павел Доўгаль, Сяргей Коршун і Андрэй Смірноў упершыню заваявалі срэбныя ўзнагароды ў камандным заліку на сусветным першынстве ў Будапешце.

ШАХМАТЫ: ПАСЛЯ АНАНДА І КАРПАВА

Галоўны турнір шахматнага фестывалю ў Біле (Швейцарыя) прынёс перамогу Вішванатану Ананду з Індыі, які ў 10 партыях набраў 7 ачкоў. На паўачка адстаў чэмпіён свету па версіі *FIDE* Анатоль Карпаў, на паўтара — мінчанін Барыс Гельфанд, які заняў трэцюю пазіцыю ў выніковым пратаколе.

ГАРАЧЫЯ ЖАНЧЫНЫ

Два гады таму амерыканка Лін Кокс пераплыла адзін з самых халодных праліваў свету — Берынгаў, у якім нават летам сустракаюцца дрэйфуючыя льды. Яе суайчынніца Гэйл-Мірыам Х'юз на днях паўтарыла подзвіг Кокс, пераадолеўшы адлегласць каля 4 кіламетраў, якая раздзяляе астравы Малы Дыямід (ЗША) і Ратманава (Расія).

Сямён ПЛОЦ

КОШТЫ РЭКЛАМНАЙ ПЛОШЧЫ ў газеце **СВАБОДА:**

у рэкламным блоку — **39000** руб./см²
на асобнай паласе — **47000** руб./см²
у тэлевізійнай праграме — **52000** руб./см²
на першай паласе — **130000** руб./см²

Форма аплаты – любая. Традыцыйныя скідкі для турыстычных фірм.

Даведкі па тэл. 236-24-41

Чытайце газету **СВАБОДА** ў *Internet*
http:\\www.gis.minsk.by

Адрас *E-mail* для даведак: edit@svaboda.minsk.by

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА ў Internet: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 34.950
Нумар падпісаны ў друк 4.08.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 336